незалежная газета

№ 9 (655) 3 сакавіка 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

першая беларуская газета

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## EUobserver.com: Лукашэнка ездзіў у Швейцарыю рабіць аперацыю

Старонка 5

## Вайна Зімоўскага з Пяткевіч

Старонка 2



## Вітаўта зробяць каралём пасмяротна?

Старонка 11

**У НУМАРЫ**

**«Луч» ціха прадалі кампаніі Franck Muller**

На Гадзіннікавым заводзе будзе скарочана 300 працоўных месцаў. **Старонка 4.**

**«Адкруцілі нават заднюю сценку пральнай машыны»**

Ператрус у Святланы Калінкінай. **Старонка 8.**

**Паэт без гальштука**

Раю нашаму слаўнаму паэту Леаніду Дранько-Майсюку дысцыплінаваць фантазію. Піша Уладзімір Арлоў. **Старонка 10.**

# Цэны растуць ва ўсіх кірунках

Фактычна за адзін тыдзень падаражэлі газ, бензін, цукар і праезд у гарадскім пасажырскім транспарце. Якія прычыны і абставіны гэтага павелічэння цэн?

Праезд у грамадскім транспарце падаражэў з 1 сакавіка. Па ўсёй краіне — на 100 рублёў. У Мінску квіток будзе будзе каштаваць 700 рублёў, у астатніх гарадах — 600 рублёў.

Падаражанне праезду — адно з патрабаванняў Міжнароднага валютнага фонду. Дый транспартнікі маюць пакуль недасяжныя паказнікі па акупнасці.

Як заўжды, павелічэнне цэн выклікае незадаволенасць.

**Працяг на старонцы 4.**

# Беларускае золата

Гутарка з алімпійскім чэмпіёнам Аляксеем Грышыным.

**«Наша Ніва»: Аляксей, як Вы апынуліся ў фрыстайле? Гэта не самы папулярны від спорту. Чаму не футбол, не хакей?**

**Аляксей Грышын:** Я пачынаў з гімнастыкі. Але ў мяне такая праблема, што ў мяне да канца не гнуцца косці ў лакцях, таму з гімнастыкай давялося завязаць. Трэнеры параілі мне знайсці новую спартыўную секцыю. Бацькі ў газеце знайшлі абвестку, што набіраецца група хлопчыкаў на фрыстайл. Я пайшоў туды, мне тады было ўсяго сем гадоў. Было цяжка, як любому спартсмену, але кінуць фрыстайл не хацеў ніколі. Спачатку займаліся скачкамі на батуце, у ваду. Потым пачаліся першыя скачкі з трампліна. Не ведаю, чаму не футбол. Можа таму, што ў фрыстайле была нейкая навізна.

**«НН»: А бацькі не хваляваліся, што аддалі сына ў такі небяспечны від спорту?**

**АГ:** Спачатку проста ніхто не ведаў, што гэта такое. Ведалі, што гэта нешта звязанае з горнымі лыжамі. Таму асабліва не хваляваліся. Потым, калі даведаліся болей, задумаліся. Але каб забіраць мяне з фрыстайлу, то да такога не даходзіла.

**Працяг на старонцы 9.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Аляксей Грышын з жонкай Ірынай.

# На галаве папаха, на грудзях надпіс «ЗаКолю!»




**Ліпковіч спрабуе афіцыйна зацвердзіць у Адміністрацыі прэзідэнта свой перадвыбарны постэр, на якім — фота кандыдата на тле Нацыянальнай бібліятэкі. На галаве папаха, на грудзях надпіс «За Колю!»**

Эпатажны блогер Ліпковіч ідзе ў дэпутаты. Чыноўнікі не ведаюць, як рэагаваць.

Вязаная шапачка, чорныя акуляры, спартовая куртка, заплечнік — Яўгена Ліпковіча можна было б палічыць падлеткам, калі б не густыя пагрозлівыя вусы. Ужо другі тыдзень яны наводзяць жах на Першамайскую раённую выбарчую камісію сталіцы: эпатажны блогер Ліпковіч ідзе ў дэпутаты.

Пра намер балатавацца на мясцовых выбарах Яўген Ліпковіч абвесціў у сваім інтэрнэт-дзённіку 14 лютага. Яго мэта — захаваць Севастопальскі парк у Мінску ад магчымага, на яго думку, знішчэння. «Адчуваючы пах вялікага хабару (афіцыйны кадастравы кошт зямлі ў раёне парку — 10 000$ за сотку, а рынкавы — у тры разы вышэйшы), упраўленцы любымі спосабамі жадаюць нарэзаць Севастопальскі парк пад забудову», — папярэджвае Ліпковіч.

### На вопыце кефіру

Скандальнаму блогеру ўжо знаёмы смак перамогаў над чыноўнікамі. У 2007 г., змагаючыся за вяртанне дыетычнага кефіру на паліцы крамаў, ён тэрарызаваў тэлефанаваннямі міністэрствы і нават дамогся афіцыйнага дэпутацкага запыту пра «кефірную праблему». У выніку на загад віцэ-прэм'ера Івана Бамбізы Гармалзавод №2 распачаў-такі выраб дыетычнага кефіру.

Блог Яўгена Ліпковіча, у якім ён і ў хвост і ў грыву крытыкуе парадкі Рэспублікі Беларусь, мае больш за дзве тысячы сталых падпісчыкаў, а выпадковых наведнікаў — яшчэ болей. Яго заява выклікала ўсплёск сатырычнай творчасці ў інтэрнэце. Праўда, заангажаваць чытачоў на рэальную палітычную дзейнасць было цяжэй. Тым не менш, Ліпковіч здолеў стварыць і зарэгістраваць ініцыятыўную групу.

**Працяг на старонцы 8.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Зімоўскі выйшаў на «сцежку вайны» з Пяткевіч

Пра ўзаемную «сімпатыю» старшыні Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага і першага намесніка кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Наталлі Пяткевіч вядома даўно. Але да часу свае пачуцці адно да аднаго яны не афішавалі. Аднак у першы дзень вясны Зімоўскі паднёс Пяткевіч «падаруначак».

Інтэрнэт-газета «Беларускія навіны» апублікавала артыкул шэфа НДТРК «Улада такая апазіцыя». І хоць імя Наталлі Пяткевіч там не згадваецца, частка гэтага твора можа быць расцэненая як «наезд» на першага намесніка прэзідэнцкай адміністрацыі.

У прыватнасці, Зімоўскі адзначыў, што «кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі разгортваецца, a propos, пры поўнай адсутнасці афіцыйнай ідэалогіі». Гэта ўжо важкі камень у агарод Пяткевіч, якая, як вядома, кіруе менавіта пытаннямі ідэалогіі.

Але шэф НДТРК на гэтым не спыняецца і працягвае гарэзіць: «Нядаўна ўзорны беларускі ідэолаг быў тоўсты, тупаваты і прастадушны. Перад тварам пастаўленых задач ён часам-такі захоўваў здаровы розум і цвёрдую памяць альбо разам страчваў і тое, і другое.



**Такой карцінкай А. Зімоўскі праілюстраваў свой артыкул.**

Не тое цяпер. Цяпер усё танчэйшае, мудрэйшае і хітрэйшае. Атрымаеш ў працу цыркуляр — і проста смешна: відаць, што памяць у аўтараў цвёрдая, а здаровага розуму як не было. Атрымаеш наўздагон наступны — і здзіўляешся: адкуль узялося ў іх столькі здаровага розуму? І куды падзелася ўся цвёрдая памяць? Не ідэалогія, а сляза камсамолкі».

Намёк на «слязу камсамолкі» больш чым празрысты. А для тых, хто ўсё яшчэ сумняваецца ў тым, што Зімоўскі піша менавіта пра Пяткевіч, нагадаю: менавіта яна на нядаўнім семінары ідэалагічных работнікаў Мінскай вобласці заявіла, што трэба дзейнічаць «танчэй, мудрэй, хітрэй».

Заадно старшыня НДТРК прайшоўся па электараце: «Беларускі народ-баганосец мае асаблівы дар: колькі яго ад прорвы ні адводзь — ён усё адно да яе прэ». Затое не забыўся пахваліць Аляксандра Лукашэнку, назваўшы яго «геніем», і выказаць упэўненасць у яго пераабранні.

Да апошняга часу Зімоўскі эпатаваў Пяткевіч у асноўным з дапамогай недвухсэнсоўных рэзалюцыяў, якія накладаў на цыркуляры, што паступалі ад першага намесніка кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі. У далейшым дакументы з пазнакамі старшыні НДТРК клаліся ў тым ліку на стол яго намесніка Аляксандра Мартыненкі, які адначасова з'яўляецца мужам Наталлі Пяткевіч.

Каб дазваляць сабе такія пікантныя вольнасці ў абыходжанні з «жалезнай лэдзі з Карла Маркса, 38», трэба мець у гэтым жа будынку падтрымку на самым верхнім паверсе.

Мяркуючы па ўсім, Зімоўскі адчувае сябе дастаткова ўпэўнена, калі пераводзіць супрацьстаянне з закрытай фазы ў публічную сферу. Чым адкажа Пяткевіч?

**Вадзім Ліўнеў, gazetaby.com**

**Зімоўскі пра сітуацыю ў краіне і адарванасць Пяткевіч ад жыцця**

«У суботу цана бензіну ў Беларусі перасягнула псіхалагічную мяжу $1/літр (у ЗША — 70,1 цэнта/літр). Пытанне: дзеля чаго мы перапрацоўваем 25 мільёнаў тонаў нафты за год?

Пігулку цудоўна падсаладзілі, павялічыўшы цэны на цукар–пясок. За што ж мулаты і крэолы, жыхары аграгарадкоў, гнулі спіны на плантацыях, ссыпаючы ў засекі Радзімы 3,725 млн тонаў Beta vulgaris (на 6,4% больш за план)?

І чаму Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь абвясціў, што ў рэальным выражэнні сярэдні заробак працаўнікоў у студзені зменшыўся на 9,2% у параўнанні са снежнем мінулага года?

І вось рабочы і калгасніца, што цэлы дзень пераганялі нафту і/або палолі салодкі караняплод, выходзяць на праменад. Настрой у іх паганы, на прымусовую падпіску з іх утрымалі, яны духоўна галодныя. Ідуць яны, скажам, культурна адпачыць на «Мінск–Арэну». А там замест твару Беларусі за дзесяць тысяч рублёў ім прапаноўваюць ВІА Rammstein па сто рэйхсмарак, ды яшчэ на галёрцы.

Такі сацыяльна–эканамічны фон неафіцыйнай кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі. Прычым кампанія тая разгортваецца «a propos, пры поўнай адсутнасці афіцыйнай ідэалогіі».

## У 2009-м у рэанімацыях Мінска ад пнеўманіі памерлі 123 чалавекі

У 88 з іх быў вірус свінога грыпу.

Пра гэта паведаміў галоўны пазаштатны анестэзіёлаг-рэаніматолаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Аляксандр Дзядзько 22 лютага на рэспубліканскай канферэнцыі паводле вынікаў працы анестэзіёлага-рэанімацыйнай службы за 2009 год у Мінску.

Паводле яго слоў, усяго летась у сталіцы з дыягназам «пнеўманія» было шпіталізавана 11 тыс. 550 чалавек, што на 2 тыс. 225 больш, чым у 2008 годзе.

«Гэта, напэўна, і ёсць колькасць пнеўманій, выкліканых новым вірусам», — мяркуе Дзядзько.

**БелаПАН**

## СЦІСЛА

### У пятніцу схаладае да мінус 18°C

У Беларусь вернецца марознае надвор'е. 4—5 сакавіка чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, невялікі снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу мінус 3—10°C, пры праясненнях да мінус 13°C; днём 0 — мінус 7°C. 5 сакавіка ноччу мароз можа дасягаць мінус 18°C.

### Рэпер Сярога: Хочаш кагосьці ўдарыць, удар мяне

Рэпер Сярога і чэмпіёны свету па тай-боксе далучаюцца да ініцыятывы супраць гвалту ў сям'і. «Я хлопец просты і тым не менш гляджу ў карэнь», — сказаў Сярога. Паводле словаў выканаўцы, ён гатовы зрабіць свой унёсак у ініцыятыву: зняць сацыяльныя ролікі са слоганам «Хочаш кагосьці ўдарыць, удар мяне».

### «Белавія» адновіць палёты Мінск—Сочы

«З 26 мая «Белавія» пачне выконваць традыцыйныя летнія палёты паміж Мінскам і Сочы», — сказалі ў кампаніі. Рэйсы будуць выконваць на камфартабельным «Боінгу-737» двойчы-тройчы на тыдзень. Квіток туды і назад будзе каштаваць ад 170 еўра, што эквівалентна кошту падарожжа цягніком.

### Адпачынак у Крыме падаражэе на 10—12%

Як чакаецца, цана аднаго турдня ў Еўпаторыі сёлета будзе складаць 180 грыўняў, або 70 тыс. рублёў на беларускія грошы.

**ЗП, СГ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў. З 1 красавіка ён вырасце да 7500 рублёў у сувязі з ростам рознічнай цаны.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
| --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | |

Агулам
Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
| --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | |

Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перапказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй

**падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю**

Яўгенію К., Уладзіміру К., С.П., Святлане Р., Вользе Ш., Т.М., Аляксандру С., Віталю К., Таццяне В., Юрыю Г., Ліліі Ж., М.К., М.А., М.Л,, С.А., Юрыю А., У.Р., К.М., Генадзю Ц., Алегу А. з Мінска.
Вользе Б. са Столінскага раёна.
Мікалаю Т. з Асіповіцкага раёна.
Яўгенію С., Аляксандру А., Уладзіміру З. з Пінска.
А.А., Івану Н. з Мінскага раёна.
Мікалаю К. з Полацкага раёна.
А.Р., Б.З. са Смалявіцкага раёна.
Сяргею Т. з Лідскага раёна.
Віктару Д. з Капыльскага раёна.
Аляксандру Ф., В.К., Дзмітрыю С. з Гродна.
Валерыю Д. з Гомеля.

# Уладзімір Някляеў: «Гавары праўду»

**25 лютага быў дадзены старт новай грамадзянскай кампаніі.**

Яе заснавальнікамі выступілі пісьменнікі Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка, заснавальнік фонду «Дзеці Чарнобыля» Генадзь Грушавы, шахматыст Віктар Купрэйчык, акадэмік Радзім Гарэцкі, праваабаронца Таццяна Працько. Лідэрам абраны пісьменнік **Уладзімір Някляеў (на фота)**.

Прэзентацыя грамадзянскай кампаніі прайшла ў мінскім гатэлі «Краўн Плаза». Яшчэ перад пачаткам імпрэзы Някляеў і Бураўкін падпісвалі ўсім ахвочым свае тамы з серыі «Беларускі кнігазбор». Выданне выбраных твораў Някляева выйшла з друкарні якраз у гэты дзень.

«Калі б не было гэтай прэзентацыі, то дзень бы склаўся ў мяне зусім паіншаму», — жартаўліва зазначыў пісьменнік.

Перш-наперш Някляеў зачытаў зварот ініцыятыўнай групы. «Усведамляючы ману як небяспеку для існавання нацыі, мы пачынаем агульнанацыянальную кампанію «Гавары праўду!» Каб па праўдзе жыць, трэба праўду казаць. Гэта цяжка, але давайце паспрабуем».

«Распачатая намі кампанія не з'яўляецца палітычнай. Гэта маральная акцыя, — кажа У.Някляеў. — Я неаднойчы спрабаваў стварыць падобны рух, арганізацыю, якая б мела на мэце не палітыку, а культуру».

Па яго словах, мэтай кампаніі ёсць данясенне да беларускага грамадства рэальнага становішча ў краіне. Сярод першых ініцыятываў грамадзянскай кампаніі — гэта данясенне праўдзівай сітуацыі, якая склалася з беспрацоўем.

Таксама выпушчана 200 тысяч паштовак, якія можна накіроўваць у Адміністрацыю прэзідэнта, напісаўшы «праўду пра важную праблему, каб яе можна было пачаць вырашаць». Паштоўкі, дарэчы, выйшлі на расійскай мове.



Уладзімір Някляеў дастукаўся да нябедных людзей.

Юлія Дарашкевіч

Генадзь Грушавы зазначыў, што гэтай кампаніяй яны працягваюць тую справу, якую больш за 20 гадоў таму пачыналі Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Васіль Несцярэнка.

Пацікавіліся ў Някляева, ці збіраецца ён вылучацца ў прэзідэнты.

«Не,» — адказаў лідэр кампаніі. Ён расказаў, што да яго сапраўды звярталіся «нябедныя людзі, каб ён вылучаўся кандыдатам», аднак пісьменнік адмовіўся. Што гэта за людзі? Гэта беларусы, якія вымушаныя былі з'ехаць з краіны і жывуць пераважна ў Расіі.

«Потым я падумаў, што гэтыя людзі будуць шукаць іншага чалавека, і ўсё адно знойдуць. Я звярнуўся да іх з падобнай непалітычнай ініцыятывай. Спачатку яны адмаўляліся, казалі, што гэта дысідэнцтва. Аднак, я стукаў і ўсё ж дастукаўся да іх», — сказаў У.Някляеў.

Тым не менш, было зазначана, «калі кампанія пойдзе паспяхова, то яна будзе ўплываць на выбарчую кампанію».

Першыя вынікі кампаніі заснавальнікі абяцаюць падвесці ўжо праз месяц. Яны сцвярджаюць, што на бліжэйшы год у іх ёсць канкрэтны план дзеянняў.

Пра тое, што са сродкамі ў кампаніі ўсё ў парадку, можа сведчыць і той факт, што на фуршэце пасля прэзентацыі частавалі дарагімі гатункамі сыру, а таксама чырвонай ікрой.

А ўжо праз тыдзень выйшаў першы нумар бюлетэня «Трымайся праўды», на 82 старонках.

**Зміцер Панкавец**

## Брат Дзмітрыя Паўлічэнкі быў затрыманы праз наркотыкі

На прэс-канферэнцыі 2 сакавіка першы намеснік міністра ўнутраных спраў Алег Пякарскі пацвердзіў, што брат Паўлічэнкі затрымліваўся КДБ за знікненне шэрагу наркатычных сродкаў з Рэспубліканскай турэмнай бальніцы, якая падпарадкоўваецца Дэпартаменту выканання пакаранняў. Цяпер ён вызвалены, але вядзецца следства.

Другая гучная справа, пра якую ўзгадаў Пякарскі, — знікненне былога начальніка Гродзенскай абласной міліцыі Генадзя Хацько (гл. «НН» №8).

Следства не выключае, што цяпер генерал можа знаходзіцца за межамі Беларусі. Пякарскі пацвердзіў, што адзін з пунктаў абвінавачвання супраць Хацько — незаконнае будаўніцтва катэджа.

«Цяпер мы не можам устанавіць дакладна месца знаходжання генерала, — сказаў А.Пякарскі. — Апошнім часам ён знаходзіўся ў падаўленым стане. Ён доўгі час адпрацаваў у органах міліцыі. Шмат зрабіў для дзяржавы».

**ЗП**

## Міліцыя: Па выбуху 4 ліпеня падазраваных няма

**120 чалавек затрымліваліся, 900 допытаў, 600 ператрусаў — на глум.**

Першы намеснік міністра ўнутраных спраў Алег Пякарскі расказаў і пра расследаванне выбуху ў Мінску 4 ліпеня 2008 г. падчас святкавання Дня Рэспублікі.

Пякарскі зазначыў, што за перыяд, што прайшоў ад часу выбуху, былі праведзеныя 900 допытаў, 600 ператрусаў, знойдзена 150 кг выбуховых прыстасаванняў. 120 чалавек затрымліваліся як падазраваныя ў злачынстве.

Пякарскі падкрэсліў, што ўсе асобы, на распаўсюджаных міліцыяй фатаграфіях, устаноўлены.

Міліцыя настойвае на тым, што выбух 4 ліпеня здзейснены з хуліганскіх матываў, але ні падазраваных, ні асобаў, датычных да выбуху, няма.

4 ліпеня 2008 года падчас святкавання Дня незалежнасці на канцэрце ля стэлы «Мінск — горад-герой» адбыўся выбух. Выбухнула самаробная прылада, нашпігаваная гайкамі і цвікамі. У выніку пацярпелі 54 чалавекі.

**ЗП**

## Дзень Волі-2010: ад Акадэміі навук да сквера Купалы

**Такое рашэнне прыняў на сваім пасяджэнні 2 сакавіка прэзідыум Беларускага незалежніцкага блока.**

Акцыя пачнецца а 18-ій гадзіне на пляцоўцы перад будынкам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, потым дэманстранты маюць прайсці да сквера імя Янкі Купалы, паведаміў старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч. У сераду ініцыятары збіраюцца падаць заяўку ў Мінгарвыканкам.

**ЗП**

## Пракуратура растлумачыла чыноўніцы правы грамадзянаў

**Але парушэнняў заканадаўства з боку Таісы Данілевіч не знайшлі.**

19 лютага Мінская абласная пракуратура даслала нясвіжскаму настаўніку Алесю Язвінскаму («НН» №4 ад 27 студзеня) адказ на яго скаргу. Ён скардзіўся на дзеянні загадчыцы ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таісы Данілевіч. 15 студзеня яна выклікала да сябе шэсць настаўнікаў. Усе шэсць удзельнічаюць у апазіцыйных партыях. Па словах педагогаў, чыноўніца ў грубай форме запатрабавала ад іх або звольніцца, альбо сысці з партый. Язвінскі і Ільініч звярнуліся ў пракуратуру.

У адказе з пракуратуры гаворыцца, што, згодна з тлумачэннямі Данілевіч, а таксама яе намеснікаў Семенчука О. і Малец Л., настаўнікаў насамрэч выклікалі ў вобласць, але для размовы пра якасць працы.

«Сапраўды, пры гэтым выказваліся меркаванні пра розныя палітычныя погляды суразмоўцаў. Аднак Данілевіч Т. не патрабавала ад Вас ... выхаду з партыі альбо звальнення з працы», — гаворыцца ў лісце за подпісам в.а. пракурора Мінскай вобласці М.Пілінкевіча.

Пры гэтым «з мэтай недапушчэння парушэння дзейнага заканадаўства і вырашэння сітуацыі Данілевіч Т. была запрошаная ў пракуратуру Мінскай вобласці, дзе ёй растлумачылі канстытуцыйныя і працоўныя правы грамадзянаў, у тым ліку і на свабоду думкі і пераканання, а таксама права грамадзянаў Рэспублікі Беларусь на свабоду аб'яднанняў у палітычныя партыі».

**Сямён Печанко**

## Суд над Аўтуховічам — 10 сакавіка

Судовы працэс над прадпрымальнікам Міколам Аўтуховічам і былым вайскоўцам Уладзімірам Асіпенкам пачнецца 10 сакавіка ў Вярхоўным судзе. Справу будзе разглядаць суддзя Аляксей Цяцюхін.

Вядома, што працэс пачнецца як адкрыты, але потым ягоны фармат вызначыць суддзя. Адвакат Аўтуховіча Павел Сапелка мяркуе, што справа можа разглядацца і пры зачыненых дзвярах.

Аўтуховіч і Асіпенка ад 8 лютага 2009 года знаходзяцца ў СІЗА на Валадарскага. Спачатку іх абвінавачвалі ў падпале дамоў ваўкавыскага міліцыянта і падаткавіка. Аднак потым абвінавачванне перакваліфікавалі ў падрыхтоўку тэрарыстычнага акту супраць былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко.

Аўтуховіч сваёй віны не прызнае. Ён кажа, што гэта помста мясцовых чыноўнікаў.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Януковіч даў маху ў Брусэлі

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч падчас знаходжання ў Брусэлі чарговы раз парадаваў журналістаў. Падчас інтэрв'ю каналу «Еўраньюс» В.Януковіч пераблытаў Косава з Сербіяй і Чарнагорыяй, а Паўночную Асецію — з Паўднёвай. Гэта адбылося падчас гутаркі, калі журналіст спытаў Януковіча, ці прызнае Украіна незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі.

На ўдакладняючае пытанне, ці гатовы Януковіч прызнаць незалежнасць Асеціі і Абхазіі, ён адказаў: «На сёння гэтае пытанне не стаіць на парадку дня. Мы мелі прэцэдэнт, які маглі не мець, але тым не менш, мы яго дапусцілі».

Свой першы візіт Януковіч 1 сакавіка зрабіў у Брусэль. У другі ён 4 сакавіка паедзе ў Маскву.

### Беларуская пракуратура дапытала Усхопчыка

1 сакавіка літоўская генпракуратура паведаміла, што атрымала інфармацыю пра допыт Уладзіміра Усхопчыка беларускімі пракурорамі. Літоўцы абвінавачваюць генерала Усхопчыка «ў злачынствах супраць чалавецтва і ваенных злачынствы» за студзеньскія падзеі 1991 года.

### Прынцыповы гамяльчук дабіваецца позваў па-беларуску

Яўген Якавенка, якога прызываюць на тэрміновую ваенную службу, звярнуўся ў Канстытуцыйны суд з сувязі з адмовай ваенкамата дасылаць позвы на беларускай мове.

**ЗП**

### 3 каментароў на nn.by

Фармальна хлопец мае рацыю. Ваенкаматы мусяць распрацаваць сістэму, пры якой падчас пастаноўкі на вайсковы ўлік мусіць быць адзначана, на якой мове грамадзянін жадае весці ліставанне і атрымліваць паведамленні з ваенкамата, і калі грамадзянін паставіў «птушку» насупраць беларускай мовы, то ўсё ліставанне з такім грамадзянінам мусіць весціся па-беларуску.

**Максей Абрамавіч**

# Цэны растуць ва ўсіх кірунках

Працяг са старонкі 1.

Тое, што мінулы раз талоны і жэтоны даражэлі ажно ў жніўні 2007 года, пасажыры стараюцца не згадваць. Кошт праезду ўзняўся на 17%, а заробак з таго часу — на 35%.

Абсалютнай аб'ектыўнасці статыстыку пазбаўляе той факт, што за два з паловай гады паспелі зьнікнуць як клас ільготныя білеты. Таму для многіх беларусаў найістотнае падаражанне праезду (ажно ў два разы), адбылося з адменай ільгот — у снежні 2007 года.

«НН» параўнала кошт праезду ў грамадскім транспарце ў Мінску і ў сталіцах суседніх краін.

Як вынікае з табліцы, менш, чым у Мінску, плацяць толькі ў Кіеве. А вось жыхары астатніх суседніх сталіц плацяць у тры-чатыры разы больш. Найдаражэйшы праезд — у Латвіі.

Варта разумець, што моцна адрозніваюцца і заробкі жыхароў суседніх краін. Колькі паездак у грамадскім транспарце можа дазволіць сярэднестатыстычны жыхар краіны? За аснову для параўнання былі ўзятыя сярэдні заробак у краіне ў канцы 2009 года і кошт адзінкавага праезду на аўтобусе.

Як бачна, беларус можа праехацца ў аўтобусе 1491 раз. Мы адарваліся ад паляка і ўкраінца больш чым на 200 паездак.

### Аўтамабілісты кампенсуюць страты бюджэту

Насельніцтва можна падзяліць на дзве катэгорыі — тыя, хто карыстаюцца грамадскім транспартам, і тыя, хто маюць уласнае аўто. Удар па гаманцах атрымалі і апошнія. І таксама па настойлівай просьбе МВФ. Фінансісты патрабуюць ад Беларусі кампенсацыю бюджэтных стратаў у сувязі з новымі ўмовамі пастаўкі расійскай нафты.

Цэны на запраўках змяніліся 27 лютага — прычым ужо другі раз за год. У студзені рост цэн склаў 2%, цяпер — яшчэ 7%. Тым не менш, нават гэтае падаражанне пакінула беларусаў з далёка не самым дарагім бензінам у рэгіёне. Ва Украіне цэны растуць яшчэ хутчэй. У суседніх краінах Еўрасаюза цэны вышэйшыя за беларускія ў два разы і больш.

### Прадпрыемствы расплацяцца за насельніцтва

Наступная пазіцыя — газ. Прынятае задняй датай 25-працэнтнае павелічэнне ўнутраных цэн павінна закрануць прадпрыемствы, а не насельніцтва. Пастановай Міністэрства эканомікі газавыя тарыфы выраслі з $174 да $217 за тысячу кубаметраў без уліку ПДВ.

«Цікавасць выклікае той факт, што газ для краіны не падаражэў увогуле! — заўважае незалежны фінансіст Сяргей Чалы. — Фактычна гаворка ідзе пра скрыжаванае субсідыяванне грамадзянаў за кошт прадпрыемстваў».

Адна з версій — Расія намякнула беларусам, што з 1 ліпеня цана газу ўзрасце. І таму ўлады імкнуцца загадзя кампенсаваць гэта.

Яшчэ месяц таму генеральны дырэктар «Белтрансгаза» Уладзімір Маёраў заяўляў, што цана на газ на 2010 год мусіць быць сфармаваная на ранейшым узроўні — каля $150. Тым не менш, цэны ўнутры краіны ўзнятыя.

### Нецукровае жыццё

Прадказаць другое за месяц падаражанне цукру было яшчэ складаней. Але агульнае павышэнне цэн ужо склала 15%. Калі яшчэ 27 студзеня кілаграм фасаванага цукру каштаваў 2336 рублёў, то цяпер ужо 2700 рублёў.

Уладу чакаюць няпростыя манeўры. З аднаго боку, каб залагодзіць насельніцтва ў перадвыбарны год, не варта чапаць цэны. З іншага — падціскае МВФ, які можа даць дадатковыя грошы альбо адмовіць. Дый само эканамічнае становішча — не цукар.

Што падаражае наступным? «Паслугі ЖКГ, — мяркуе Сяргей Чалы. — Ацяпленне, гарачая вада, электраэнергія... Як толькі скончыцца ацяпляльны сезон, тарыфы мусяць пайсці ўверх».

**Ягор Марціновіч**








| Горад | Праезд у аўтобусе (у Br) | Колькасць паездак за зарплату |
|---|---|---|
| Мінск | 700 | 1491 |
| Варшава | 2770 | 1256 |
| Кіеў | 550 | 1212 |
| Вільнюс | 2300 | 1100 |
| Масква | 1950 | 996 |
| Рыга | 2800 | 942 |

**Цэны на бензін (у Br)**

| Марка бензіна | Беларусь | Расія | Украіна |
|---|---|---|---|
| Н–80 | 1940 | 1810 | 2510 |
| АІ–92 | 2520 | 2100 | 2650 |
| АІ–95 | 2840 | 2290 | 2910 |
| Дызель | 2270 | 1840 | 2520 |

**«Мацярык» будматэрыялаў**

Новы гіпермаркет адкрыўся ў Мінску. «Мацярык» змяшчае гандлёвыя плошчы памерам 5250 квадратных метраў. Крама знаходзіцца на скрыжаванні вуліц Лабанка і Прытыцкага, каля выезда са сталіцы на гродзенскую шашу.

Гэта ўжо восьмы гіпермаркет у сталіцы і толькі другі – будаўнічага профіля. Першыя наведнікі заўважаюць, што цэны ў «Мацярыку» ў сярэднім на 5% вышэйшыя за цэны на рынках. Зрэшты, гэта асаблівасць усіх беларускіх гіпермаркетаў.

Праз дарогу ад «Мацярыка» праз два гады мусіць адкрыцца яшчэ адзін гіпермаркет, харчовы. Яго будаўніцтва адклалася праз крызіс.

**Даляр на падыходзе да 3000 рублёў**

Такі курс у абменніках можа з'явіцца з дня на дзень. Па стане на сераду Нацбанк ацэньваў амерыканскую валюту ў 2939 рублёў. Абменнікі ж маюць права ўсталёўваць абменны курс на 2% большы за афіцыйны — не больш за 2998 рублёў. Да такога курса бліжэй за ўсё падабраўся «Парытэтбанк». У аўторак ён прадаваў даляры па 2988 рублёў.

**ЯМ**



# Мінскі гадзіннікавы ціха прадалі кампаніі Franck Muller

Мінскі гадзіннікавы завод («Прамень») прададзены швейцарскай кампаніі Franck Muller. Дэталі здзелкі не разгалошваюцца. Крыніца ў дэпартаменце замежных спраў швейцарскай кампаніі рашуча абвяргае чуткі, што пасля змены ўладальніка будуць звольненыя ўсе супрацоўнікі завода, старэйшыя за 35 гадоў. Паводле кантракта, свае працоўныя месцы захаваюць 700 з 1000 рабочых.

Паводле некаторай інфармацыі, за кампаніяй Franck Muller насамрэч стаіць армянскі капітал.

**ЯМ**

# У пытанні мытаў на нафту будзе па-маскоўскаму

Беларусь вымушаная канчаткова саступіць у гэтым пытанні на два мільярды.

Камісія Мытнага саюза пасля шматгадзінных перамоваў канчаткова ўзгадніла тэкст Мытнага кодэкса для Беларусі, Расіі і Казахстана, які мае пачаць дзеянне з 1 ліпеня, паведамляе расійская газета «Камерсант». Пытанне аб нафтавых экспартных мытах Расіі не будзе абмяркоўвацца ў рамках Мытнага саюза — гэтыя пытанні вырашана ўключыць у дамовы аб стварэнні адзінай эканамічнай прасторы, якая пачне працаваць не раней 2012 года, а можа і на святога нікалі.

Але ў пытанні размеркавання мытаў ад імпарту Расія пайшла на пэўныя саступкі Беларусі — яе долю ў даходах саюза вырашана пералічыць. Дакладныя лічбы размеркавання плацяжоў пакуль не названыя.

Афіцыйныя асобы Беларусі і беларускія эканамісты не раз адзначалі, што Беларусі няма карысці ад удзелу ў Мытным саюзе, калі за яго дужкі выносяцца энерганосьбіты. Аднак Мінск наўрад ці рашыцца вырвацца з мытнай пасткі, у якую яго дурная панесла. У Мінску баяцца, што Масква зараз зможа скарыстацца фактам выхаду Беларусі з мытнага пагаднення, каб на гэтай падставе ўвесці экспартныя мыты на газ, чаго даўно дабіваецца расійскі Мінфін. А гэта прывяло б да скачка цэнаў на расійскі газ — асноўную крыніцу энергіі для Беларусі.

**Сяргей Гезгала**

# Няма дэмакратыі — не атрымаеце мільярд

Выдзяленне крэдытаў Беларусі Еўрапейскім інвестыцыйным банкам падвешанае ў сувязі з ціскам на Саюз палякаў Беларусі.

Рада ЕС мае прыняць рашэнне аб скасаванні крэдытных праграм для Беларусі альбо іх разблакаванні. Памер запланаваных крэдытаў для Беларусі дасягаў 1 млрд. еўра

На сёння беларускі бок выявіў цікаўнасць у 500 млн еўра дапамогі ЕІБ для фінансавання эканамічных праектаў. У прыватнасці, супольнага нямецка-беларускага праекта мадэрнізацыі Беларускай чыгункі і пабудовы лініі электраперадач Беласток-Рось, якая б стала мостам, што звязвае беларускую і польскую энергасістэмы.

Віцэ-прэзідэнт ЕІБ Моніка Гаенцка паведаміла, што частка крэдытаў магла б трапіць у беларускія банкі для фінансавання праграм развіцця сярэдняга і дробнага прадпрымальніцтва. «Крэдыты ЕІБ — адзіная магчымасць фінансавага ціску Еўрасаюза на беларускія ўлады», — заявіла яна.

Еўрапейскі інвестыцыйны банк створаны краінамі ЕС для фінансавання гаспадарчых праектаў і выдзяляе крэдыты на значна больш выгадных умовах, чым камерцыйныя банкі. Планавалася, што да 2013 г. ЕІБ рэалізуе ў Малдове, Расіі, Украіне і Беларусі праекты агульным коштам у 3,7 млрд. еўра.

**Алесь Пілецкі**

## СЦІСЛА

**Студэнтам даплацяць**

Задняй датай, з 1 студзеня, на 5% павялічаныя стыпендыі ў навучальных установах. Штомесячныя выплаты павялічацца на 6—7 тысяч рублёў. Ва ўніверсітэтах сярэдняя стыпендыя цяпер складзе каля 135 тысяч рублёў, а ў тэхнікумах і вучэльнях — каля 110 тысяч.

**Velcom стане цалкам аўстрыйскім?**

Кампанія Telekom Austria Group ужо валодае 70% акцый мабільнага аператара Velcom, якія былі купленыя ў свой час за мільярд даляраў. Цяпер аўстрыйцы вырашаюць, ці варта дакупляць астатнія 30%, якія належаць кіпрскай кампаніі. Канчатковае рашэнне будзе прынятае ў канцы года. Акцыі ацэньваюцца ў $320 мільёнаў еўра.

**Сурыкаў: прадайце нам увесь «Белтрансгаз»**

Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў мяркуе, што яго краіна зацікаўлена ў набыцці ўсіх акцый «Белтрансгаза». «Я думаю, што, калі ўжо атрымалі і аплацілі 50% акцый, то, напэўна, ёсць жаданне атрымаць больш. Інакш дзеля чаго купілялі 50%», — сказаў ён. У свой час палова акцый была куплена за $2,5 мільярда. Апошнюю частку выплат Беларусь атрымала тыдзень таму.

**Украіна не ўвойдзе ў Мытны саюз**

Першая намесніца кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Украіны Ірына Акімава тлумачыць сітуацыю: «Паколькі Мытны саюз супярэчыць сяброўству Украіны ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі, на сённяшні дзень, дый на заўтрашні, гэтае пытанне стаяць не можа».

**ЯМ**

# EUobserver.com: Лукашэнка ездзіў у Швейцарыю рабіць аперацыю на прастаце

Аўтарытэтнае выданне атрымала гэтую інфармацыю ад высокапастаўленага дыпламата ў Еўрасаюзе.

Інтэрнэт-выданне EUobserver.com піша, што ў атачэнні Лукашэнкі змагаюцца дзве групоўкі — праеўрапейская і прарасійская. І ціск на незалежны Саюз палякаў распачала прарасійская групоўка. Сам Лукашэнка ў момант абвастрэння сітуацыі быў у Швейцарыі, дзе яму, магчыма, рабілі аперацыю на прастаце. Такое дапушчэнне зрабіў для EUobserver.com высокапастаўлены дыпламат у ЕС.

Беларускае пасольства адмовілася каментаваць гэтую інфармацыю.

EUobserver.com асвятляе падзеі, звязаныя з ЕС. Гэтае вельмі інфармаванае выданне рыхтуецца ў Брусэлі.

Чуткі аб хваробе прастаты ў Лукашэнкі даўно цыркулююць і ў Мінску. Аніякай афіцыйнай інфармацыі пра здароўе кіраўніка дзяржавы не з'яўляецца.

**Мікола Бугай**

## Што такое адэнома прастаты і чым яна пагражае?

Дактары называюць тэрмін адэнома прастаты трохі састарэлым. Цяпер часцей ужываецца азначэнне дабраякасная гіперплазія прастаты. Што гэта такое? У прастаце, чыста мужчынскай залозе, утвараецца вузельчык ці вузельчыкі, якія растуць і паціхупамалу здушваюць мочаправодны канал. У выніку здушвання парушаецца сіканне, часам моцна.

Што значыць дабраякасная гіперплазія? Г.зн. яна не дае метастазаў. У гэтым карэнная розніца з ракам прастаты.

Як часта сустракаецца адэнома? Вельмі часта. Паводле статыстыкі, да дактароў з ёй звяртаецца палова мужчынаў, старэйшых за 50 гадоў. А ўвогуле з часам яна развіваецца ў 85 % мужчынаў.

На яе ўплывае генетыка. Да фактараў рызыкі адносяць век і ўзровень андрагенаў у крыві. Выяўнай сувязі між гіперплазіяй прастаты і полавай актыўнасцю не выяўлена, як не выяўлена сувязі і з перанесенымі запаленчымі і венерычнымі хваробамі полавых органаў.

Выдаленне прастаты не ўплывае на агульную жыццядзейнасць арганізму. Прастата канечне неабходная толькі для захавання здольнасці да працягу роду.

Рак прастаты — небяспечная хвароба, якая сустракаецца ў 2—4% мужчынаў. На ранніх стадыях добра вылечваецца. Ужываецца радыкальны метад лячэння: выдаляецца прастата і ажыццяўляецца кастрацыя.

Пры выяўленні рака на ранніх стадыях пацыент можа пражыць нават дзясяткі гадоў пасля аперацыі.

Пры з'яўленні сімптомаў уралагічнага захворвання — боляў, ускладненасці сікання, поклічаў да сікання ўначы, калі раней такога не бывала — дактары просяць неадкладна звяртацца да іх.




**Сяргей Гезгала**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Сябры і прыхільнікі Рыгора Барадуліна сабраліся ля бальніцы 24 лютага, каб перадаць юбіляру кветкі і падарункі. Валянціна Барадуліна размаўляе з Уладзімірам Арловым.**

## Лукашэнка праігнараваў Барадуліна. Мартынаў, Латушка і Абельская павіншавалі

Галоўная доктарка прэзідэнцкай клінікі Ірына Абельская прэзентавала паэту 17 шыкоўных ружаў.

Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін 1 сакавіка пераведзены з рэанімацыі ў тэрапеўтычнае аддзяленне Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, паведаміў сябар Барадуліна Генадзь Бураўкін.

«Яму значна лепей. Ён ужо ходзіць. Кашаль пакуль ёсць, але няма тэмпературы», — кажа жонка паэта Валянціна.

24 лютага дзядзька Рыгор адзначыў сваё 75-годдзе. Валянціна Барадуліна паведаміла, што ў дзень нараджэння з высокапастаўленых чыноўнікаў яго павіншавалі міністры замежных спраў Сяргей Мартынаў і культуры — Павел Латушка. А галоўная доктарка бальніцы Ірына Абельская падаравала букет з 17 ружаў.

Аляксандр Лукашэнка юбілей народнага паэта Беларусі прапусціў. Альбо праігнараваў. Затое, напрыклад, павіншаваў з юбілеем Юрыя Антонава і, з прызначэннем, губернатарку Ханты-Мансійскай акругі.

Рыгор Барадулін знаходзіцца ў бальніцы з запаленнем лёгкіх ад 14 лютага.

**КМ**

# АНТ паказала нейтральны фільм пра Янку Філістовіча

На тэлеканале АНТ вечарам у пятніцу быў прадэманстраваны фільм Людмілы Клінцовай «Шпіён з-пад Вілейкі». Гэты дакументальны фільм дэманстраваўся ў рамках праекта «Зваротны адлік» і быў прысвечаны асобе Янкі Філістовіча.

Перадача была вытрыманая ў нейтральных танах. Нават служба Філістовіча на немцаў была растлумачаная як непрыманне ім савецкай акупацыі, падчас якой быў рэпрэсаваны бацька Янкі. Ніводнага негатыўнага слова не было сказана пра пасляваенныя эміграцыйныя арганізацыі беларусаў у Заходняй Еўропе, а таксама пра асобу Барыса Рагулі.

У перадачы была агучаная лічба, што пасля 1950 года ў беларускіх лясах заставалася каля 10 тысяч партызанаў-антысаветчыкаў. Таксама ў перадачы прызнаецца, што шмат дзе яны мелі падтрымку мясцовага насельніцтва, бо ў краіне праводзілася калектывізацыя, рэпрэсіі.



**Беларускія партызаны ў Ільянскім раёне. 1952 год.**

Звяртае ўвагу, што Філістовіча не выдаў ніводзін з 18 допытаных па яго справе вяскоўцаў. Нават селянін, у якога ён хаваўся параненым, яго не выдаў. У дачыненні да Янкі ні разу не прагучала словаў кшталту «бандыт». Сама ж аперацыя па вылоўліванні дыверсанта была названая ледзьве не ўзорнай. А Філістовіча высока ацанілі як канспіратара і інтэлектуала.

У фільме быў агучаны такі цікавы факт: сярод лістоў Філістовіча была знойдзена запіска са словамі: «У горадзе в.ш. войскаў». Чэкісты так і не змаглі расшыфраваць гэты надпіс. Тады ўрэшце Янка сказаў следчаму: «Вам даравальна, вы каўказец. Але няўжо сярод вас няма ніводнага беларуса? В.ш. — гэта значыць «вельмі шмат».

Фільм здымаўся з выкарыстаннем архіваў КДБ. Аднак упершыню ў ім не было савецкай прапагандысцкай мантры. Такая нейтральная пазіцыя ў дачыненні да Філістовіча выглядае досыць нечаканай і новай.

**Зміцер Панкавец**



**Янка Філістовіч**

малады беларускі эмігрант, які на заданне Рады БНР у супрацы з амерыканскай выведкай дэсантаваўся ў Беларусі дзеля збору інфармацыі і гуртавання партызанаў. Ён хаваўся ў лясах пад Вілейкай год. Пасля арышту яго расстралялі. У фільме было заўлена, што Філістовіч выклікаў у следчых МГБ павагу, але яны лічылі яго беларускім фанатыкам.

# Не півам адзіным

Ад 23 лютага беларусам пагражаюць шматлікія новыя штрафы.

З 23 лютага ўступілі ў сілу ўнесеныя змены ў Адміністратыўны і Крымінальны кодэксы Беларусі. Галоўнае ноў-хаў, якое абмяркоўваецца ў грамадстве актыўней за ўсё, — штраф за распіццё піва ў грамадскіх месцах (да 280 тысяч рублёў).

Апроч таго, кардынальныя змены зачапілі шэраг іншых момантаў. Прывыкаць на навінак прыйдзецца аўтаматарам. Калі размова па мабільніку ў час руху па дарозе прывяла да стварэння аварыйнай абстаноўкі, гэта можа каштаваць небараку ад 175 да 700 тысяч з пазбаўленнем правоў кіроўцы. П'яны кіроўца апроч пазбаўлення правоў на тры гады яшчэ і заплаціць штраф да 1225 тысяч рублёў. Узмоцненая адказнасць і для пешаходаў. Парушэнне правілаў дарожнага руху цяпер каштуе ў шэсць разоў больш — да 105 тысяч рублёў, калі ж сп'яну – да 175 рублёў. Адсутнасць флікера ацэньваецца ў шэсць разоў больш, чым раней, — да 105 тысяч.

Істотна ўзмоцніцца адказнасць і за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. З бабулькамі ў пераходах усё зразумела — іх можа чакаць штраф да 105 тысяч і канфіскацыя прадмета парушэння, напрыклад, семак. Але па тым жа артыкуле можа быць канфіскаваныя аўтамабіль (для нелегальных таксістаў) і нават кватэра (за арэнду без заключэння дамовы). Праўда, падаткавікі абяцаюць, што такія радыкальныя меры яны будуць прымаць толькі ў выключных выпадках.

**Ягор Марціновіч**

### Новыя штрафы

| Парушэнне | Новае пакаранне | Старое пакаранне |
|---|---|---|
| Прапаганда, дэманстрацыя і распаўсюд нацысцкай сімволікі | Штраф да 350 тысяч ці арышт | — |
| Выпрабленне, распаўсюд ці захоўванне экстрэмісцкіх матэрыялаў | Штраф ад 350 тысяч да 1,75 мільёна | — |
| Выкарыстанне дзяржаўных сімвалаў з парушэннямі | Штраф да 175 тысяч | — |
| Адсутнасць кнігі заўваг і прапаноў | Штраф ад 140 да 350 тысяч | — |
| Невыкананне патрабаванняў святлафора ці рэгуліроўшчыка | Папярэджанне альбо штраф ад 35 да 175 тысяч | Ад 3,5 тысяч |
| Продаж алкагольных напояў і піва непаўналетнім | Штраф ад 700 тысяч да 1,75 мільёна | Штраф ад 70 да 350 тысяч |
| Распіццё слабаакагольных напояў і піва ў грамадскіх месцах | Штраф да 280 тысяч, пры паўторным на працягу года — штраф да 525 тысяч ці арышт | — |
| Знаходжанне на працы ў працоўны час у стане ап'янення | Штраф ад 35 да 350 тысяч | — |
| Выраб і набыццё самагона і брагі, захоўванне самагонных апаратаў | Папярэджанне ці штраф да 175 тысяч + канфіскацыя апарата | — |
| Пакупка для непаўналетніх слабаалкагольных напояў і піва | Штраф ад 350 тысяч да 1,05 мільёна | — |
| Курэнне ў забароненых месцах | Штраф да 140 тысяч | Штраф 17,5 тысяч |

**Пакет не вызваліць ад адказнасці**

Адкаркаваную ў грамадскім месцы бутэльку піва міліцыя можа ўспрымаць як правапарушэнне. Адказнасць наступае, калі, напрыклад, маладыя людзі, седзячы на лавачцы ў парку, хаваюць у пакеце бутэльку, і гэта бутэлька адкаркаваная. Супрацоўнік міліцыі мае права зазірнуць у пакет і, убачыўшы там пачатую бутэльку, прыняць адносна парушальніка ўстаноўленыя законам меры. Грамадскім месцам прынята лічыць вуліцу, стадыён, сквер, парк, грамадскі транспарт і іншыя месцы, апроч прызначаных для ўжывання алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Выпрацоўваць культуру піцця вырашана штрафамі.**



## Айсберг, які зменіць клімат у свеце

Ад Антарктыды адкалоўся айсберг плошчай з герцагства Люксембург. Навукоўцы кажуць, што гэтая падзея можа выклікаць пахаладанне ў Еўропе ў бліжэйшыя гады.

«Частку сябе» страціў ледавік Мерц, які прымыкаў да ўзбярэжжа Антарктыды, нібы паўвостраў, а на карце выглядаў як «язык» — каса лёду працягласцю 160 км.

Айсберг мае плошчу каля 2500 кв. км, што супастаўна з плошчай Люксембург ці Мінскага раёна.

Гэтая махіна можа парушыць звыклае цячэнне акіянскіх водаў. Глыба дрэйфуе ў той частцы акіяну, дзе ўтвараюцца глыбінныя плыні халоднай вады. Гэта, магчыма, выкліча змены цыркуляцыі цяпла ва ўсім акіяне і будзе ўплываць на клімат Зямлі некалькі дзесяцігоддзяў.

У прыватнасці, праз гэты айсберг у Еўропе могуць быць халаднейшыя зімы.

**КаМ**

## Рыбак: Найпрыгажэйшая песня ў свеце — «Купалінка»

Пераможца «Еўрабачання-2009» 25 лютага выступіў у Празе. Канцэрт Рыбака сабраў поўную залу музычнага бара Lucerna. У часе канцэрта спявак прызнаўся, што «Купалінка», якую яму ў дзяцінстве спявала мама, — найпрыгажэйшая песня з усіх на свеце.



## Графік цэнтралізаванага тэставання — 2010

Міністэрства адукацыі зацвердзіла графік цэнтралізаванага тэставання (ЦТ) у 2010 годзе. Яно пачнецца 14 чэрвеня іспытам па беларускай мове. 15 чэрвеня пройдзе іспыт па расейскай мове, 17 чэрвеня — па гісторыі Беларусі, 18 чэрвеня — па геаграфіі. 20 чэрвеня адбудзецца ЦТ па матэматыцы, 22 чэрвеня — па грамадазнаўстве, 24 чэрвеня — па сусветнай гісторыі найноўшага часу. 25 чэрвеня пройдзе іспыт па фізіцы, 27 — па біялогіі, 29 — па замежных мовах, 30 чэрвеня — па хіміі. Рэзервовым днём ЦТ вызначана 5 ліпеня.

**БелаПАН**



### Грабоўскі «здаровы», але «дурны»

Гэтыя словы менеджара хакейнага клуба Toronto Maple Leafs цытавалі шмат якія канадзкія выданні. Гэта была рэакцыя на ўдзел беларускага хакеіста ў вулічнай сварцы. 26-гадовы хакеіст быў затрыманы ванкувэрскай паліцыяй уначы 20 лютага.

### Сведчанне 15-гадовай, згвалтаванай чырвонаармейцамі

У Нямеччыне ўпершыню апублікаваныя не ананімныя ўспаміны ахвяры гвалту савецкіх салдат. У сваёй кнізе 80-гадовая Габрыэла Кеп распавяла, як стала ахвярай гвалту савецкіх салдат. Усяго тады пацярпела прыкладна 2 мільёны немак.

**СМ**

ЗДАРЭННІ

### Скокнуў з будынка Педуніверсітэта

Так зрабіў сабе смерць выпускнік, якога размеркавалі ў правінцыю. Трагедыя адбылася вечарам 26 лютага. Хлопец скончыў факультэт прыродазнаўства ў 2009 г. і працаваў у адным з правінцыйных гарадоў. Падчас знаходжання ў Мінску, ён скінуўся з будынка БДПУ імя Максіма Танка.

### На будаўніцтве храма загінуў бацюшка

На будоўлі праваслаўнага храма ў Брэсце загінуў настаяцель. 58-гадовы бацюшка і 42-гадовы прыхаджанін стаялі на перасоўнай пляцоўцы будаўнічага пад'ёмніка. Абарваўся трос і пляцоўка з людзьмі ўпала з вышыні. Настаяцель загінуў на месцы. Прыхаджанін у рэанімацыі.

**СМ**

СУР'ЁЗНА

### Расійская армія пакінула ў лесе 200 танкаў

У Свярдлоўскай вобласці РФ мясцовыя жыхары знайшлі 200 танкаў Т-72, пакінутых без аховы ў лесе. Люкі танкаў адчыненыя і залезці ўнутр можа любы ахвочы. Танкі стаяць у лесе з лістапада. Іх прывозілі на працягу тыдня на цягніку, выгрузілі і пакінулі ў лесе. Па словах супрацоўніка прэс-службы Мінабароны Расіі, гэта «планавая перадыслакацыя баявой тэхнікі».

**АП**

## «Маторшоу» пераносіцца на восень

Арганізатар выставы «Маторшоу» — ТАА «РэМарк» прыняў рашэнне перанесці шоу з традыцыйнай вясны на 21—26 верасня. Прычына — яшчэ канчаткова не сфармаваная заканадаўчая база па збіранні мыта на ўвоз аўтамабіляў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

КРЫМІНАЛ

### Дантыст «лячыў» пластылінам і напільнікам

У Магілёве разглядаюць справу стаматолага, які практыкаваў па падробленых дакументах. Яго кліентаў не бянтэжыла арыгінальнасць выбраных інструментаў. А сярод іх – пластылін і нават напільнік. Дыплом стаматолага махляр купіў у падземным пераходзе ў Санкт-Пецярбургу. Кабінет абсталяваў у кватэры: купіў офіснае крэсла для пацыентаў. Пасля гэтага расклеіў па горадзе аб'явы пра тое, што «кваліфікаваны доктар» дапаможа вырашыць праблемы з зубамі.

### Гвалтаўнік атрымаў 14 гадоў турмы

Суд даў 21-гадоваму мінчуку, які згвалтаваў шасцігадовую дзяўчынку, 14 гадоў пазбаўлення волі. Злачынства было ўчынена 3 кастрычніка 2009 года ў адным з інтэрнатаў Мінска. Малады рабочы прыйшоў у госці да знаёмай. Калі маці выйшла, хлопец згвалтаваў яе малую дачку.

### Краў з незамкнёных кабінетаў

У Мінску затрыманы злодзей, які спецыялізаваўся на крадзяжах з незачыненых кабінетаў. 43-гадовы мінчанін падазраецца ў трох злачынствах.

**СМ**

# Гэткія штрафы толькі на карысць

Пакуль былі малыя штрафы за піццё на вуліцы і балаканне па мабільным за стырном, — ніхто гэтыя рэчы і за парушэнні не лічыў. Змены ў Кодэксах многіх дысцыплінуюць. У Заходняй Беларусі ў часы Пілсудскага гаспадароў каралі за павалены плот, разбітую вуліцу перад сядзібай. Людзі бурчэлі, але дагэтуль у заходнікаў больш парадку і менш развалу. Часам прыходзіцца ўжыўляць у цела грамадства элементы побытавай культуры такім жорсткім спосабам.

Новыя папраўкі ў Адміністратыўным кодэксе празвалі «піўным законам». Згодна з імі, піццё піва ці чарніла ў грамадскім месцы можа абярнуцца штрафам да паўмільёна. Да новаўвядзення люд ставіцца па-рознаму. «Даўно трэба было гэта зрабіць! — кажуць настаўнікі. — Пілі ўжо нават у крамах, не адыходзячы ад прылаўка. А дзеці ж на гэта ўсё глядзяць, вучацца».

Цяпер у крамах не п’юць — участковыя атрымалі доўгачаканы стымул для шчыльнай працы з «кантынгентам». У вёсцы ўчастковы кожнага выпівоху ведае як аблупленага. Можна адразу караць рублём. А што значыць для вёскі штраф у паўмільёна пры зімовых заробках у 150 тысяч? «Хай гарадскіх штрафуюць, яны багацейшыя!» — абураюцца аматары выпіць. Напалохаліся і прадавачкі: правяраюць пашпарты ў падазрона маладых пакупнікоў, выганяюць з крамы апівудаў.

Як вынік — п’яных у працоўны час паменела. «Позна спахапіліся, каб раней, то колькі б сем’яў ды жыццяў зберaглі», — кажуць людзі. Але адчуваецца, што ініцыятыва ўладаў знайшла пазітыўны водгук у большасці. Любіць беларус дысцыпліну, што ні кажы.

**Сямён Печанко**




АНТОН МАТОЛЬКА

**Старэйшае пакаленне памятае і цэніць колішнія строгія парадкі. Фота ў Моталі.**

# Прэзідэнт здаў аналізы

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Абаму на тыдні мацалі дактары, а перад гэтым ён здаў аналізы. Першы абавязковы медагляд на прэзідэнцкай пасадзе. Цягам дня Белы дом абнародаваў вынікі: павышаны халестэрын і тэндыніт у левым калене. І строгая рэкамендацыя: менш тлушчаў і вугляводаў у ежы і асцярожнасць з нагрузкамі пры гульні ў баскетбол. Беларусам жа версіі пра здароўе афіцыйнага лідэра падкідваюць крыніцы з «гнілога Захаду».

Памятаеце, спачатку тутэйшая публіка гадала: чаму візіт Лукашэнкі ў Швейцарыю такі засакрэчаны ды ціхі. Потым праз сайт EUobserver.com нейкі высокі брусэльскі чын укінуў інфармацыйную бомбу: мэтай вандроўкі была аперацыя на прастаце.

Уявіць сабе, што Чырвоны дом агалошвае вынікі аналізаў першай асобы, як гэта робіць дом Белы, можа толькі вялікі фантаст. Паводле Наталлі Пяткевіч, «у нас няма такой традыцыі».

Мала прыемнага, калі твае аналізы выстаўляюць напаказ усяму свету. Але ж абазваўся грыбам — лезь у гаршчок. У дэмакратыях дзейнічае прынцып большай адкрытасці асабістага жыцця публічных асоб. Дзяржаўны кіраўнік — увогуле асаблівы выпадак.

Напрыклад, Рэйгану ў 1987 годзе акурат аперавалі прастату, што выклікала дыскусію, ці здолее ён далей кіраваць Штатамі. У 2007 годзе тагачасны прэм’ер Ізраіля Ольмерт сабраў прэс-канферэнцыю, каб паведаміць, што будзе класціся пад скальпель (рак прастаты!), але ў адстаўку не збіраецца.

Калі ты наняты на працу электаратам цэлай краіны, тваё самаадчуванне, фізічны і псіхічны стан — не толькі асабістая справа! Хворы кіраўнік такога рангу можа наламаць дроў.

# «Група грамадзян» Беларусі польскай нацыянальнасці крытыкуе Польшчу і Борыс

**31 этнічны паляк з Беларусі падпісаў зварот да кіраўніцтва Польшчы. У ім яны заяўляюць, што «беларуская дзяржава ніколі не парушала і не парушае правоў грамадзянаў».**

«А.Борыс і яе невялікае атачэнне не ўпаўнаважаныя рэпрэзентаваць інтарэсы польскай меншасці», «яны дыскрэдытавалі сябе парушэннем законаў нашай дзяржавы».

Падпісанты звяртаюцца з просьбай «прыняць меры па спыненні разгулу фальшу ў польскіх медыях». Яны вераць, «што справядлівасць і розум возьмуць верх і дыскрымінацыйная палітыка польскіх уладаў да сваіх суродзічаў будзе спыненая».

Яны просяць таксама аб сустрэчы з кіраўніцтвам Польшчы.

Хто ініцыяваў зварот, не паведамляецца.

Сярод падпісантаў два пенсіянеры, хатняя гаспадыня, тры настаўнікі, кіроўца, дэпутат ад Гродна рэктар Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Вітольд Песціс, дырэктар «Гроднааблсаюздруку» Тадэвуш Ваўчкевіч, намеснік дырэктара Гомельскай філіі МТС Андрэй Градзвіцкі, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Станіслаў Каспяровіч, дырэктар паліграфкамбіната імя Якуба Коласа Генадзь Нягоцька, рэктар Акадэміі мастацтваў Рычард Смольскі, рэктар Берасцейскага ўніверсітэта Мечыслаў Часноўскі.

Частка падпісантаў не ўваходзіла ў Саюз палякаў і не мела ніякіх — ані прафесійных, ані сяброўскіх — кантактаў між сабой. Такое ўражанне, што да этнічных палякаў звярталіся нехта зверху па адмыслова складзеным спісе.

Тэкст звароту распаўсюджаны агенцтвам «Інтэрфакс», вядомым сваімі крыніцамі інфармацыі ў спецслужбах, а не дзяржаўным агенцтвам БЕЛТА.

Відаць, у пэўных структурах узгадалі, як савецкія грамадзяне габрэйскай нацыянальнасці «добраахвотна падпісвалі» звароты з асуджэннем міжнароднага сіянізму. Гэты вопыт выкарыстаны ў прапагандысцкай вайне з Польшчай, разгорнутай вакол Саюза палякаў. Можна ўявіць пачуцці грамадзянаў, калі да іх звяртаюцца з просьбай «не до оджуцэня» пра падпісанне падобнага звароту.

**Мікола Бугай**

ДАСЛОЎНА

## Падпісант: Напружанасць з палякамі нагнятаецца звонку

Карэспандэнт «НН» гутарыць з кандыдатам медыцынскіх навук, галоўным урачом ГТМА Бярозаўскага раёна Іосіфам Дзежыцам, які быў сярод тых, хто падпісаў зварот.

**«Наша Ніва»: Іосіф Адольфавіч, можна задаць некалькі пытанняў адносна падпісанага Вамі звароту да кіраўніцтва Польшчы?**

**Іосіф Дзежыц:** Я нічога не падпісваў.

**«НН»: Ну як жа? А зварот грамадзянаў Беларусі польскай нацыянальнасці?**

**ІД:** А, ну гэты падпісваў.

**«НН»: А што падштурхнула да гэтага?**

**ІД:** Ну, гэта маё ўласнае меркаванне. У Беларусі насамрэч створаны ўсе ўмовы для развіцця нацыянальных меншасцяў. Спробы падзяліць палякаў на «нашых» і «нянашых» наканаваныя на правал. А то цяпер гэтая сітуацыя нагадвае вывяржэнне вулкана.

**«НН»: А хто выходзіў на Вас з такой ініцыятывай?**

**ІД:** Ніхто.

**«НН»: Вы ў Саюзе палякаў, якім кіруе Станіслаў Сямашка?**

**ІД:** Так. Узначальваю бярозаўскую суполку. Яна налічвае 43 чалавекі. Уваходжу ў склад кіраўніцтва Саюза. Сядзеў у прэзідыуме падчас з’езду. Мяне сябры па тэлевізары бачылі.

**«НН»: А якія мерапрыемствы ладзіце?**

**ІД:** Зборы, паездкі людзей у Польшчу. Вось апошнім часам у Гайнаўку ездзілі.

**«НН»: А польскі бок дапамагае?**

**ІД:** Якое дапамагае? Вось праходзіў наш з’езд у Гродне. Былі прадстаўнікі ад міністэрства, абласцей. А вось з польскага пасольства нікога не было.

**«НН»: А кажуць жа, што існуюць «чорныя спісы» для сяброў афіцыйнага СПБ.**

**ІД:** Так, ёсць такое. Але супраць нас не ўжывалася. Заўсёды выдавалі візу, калі прасілі. У Польшчы ў мяне прыяцелі дактары ёсць.

**«НН»: А што Вы можаце сказаць пра дзейнасць СПБ на чале з Анжалікай Борыс?**

**ІД:** Яна ігнаруе нашы пасяджэнні. Яе б многія хацелі пабачыць. Перагаварыць на тэмы, якія нас хвалююць. Нельга дзяліць палякаў. Мы адна этнічная група, якая павінна развівацца. А цяпер вось ідзе такая напружанасць, якая нагнятаецца звонку. У Борыс ёсць свая пазіцыя, ніхто не можа забараніць ёй яе выкладаць. Але цяпер яна займаецца нейкім раздзёргваннем сітуацыі. Мы хацелі б пачуць яе з першых вуснаў. Мой варыянт вырашэння пытання — круглы стол.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Беларускія грошы даражэйшыя за «русскую идею»

Месяц таму чытачы незалежных СМІ не ведалі, хто такі Андрэй Герашчанка. Пасля ў выданні трапіла інфармацыя, што гэты віцебскі чыноўнік не лічыць беларусаў нацыяй, а дзяржаву нашу хоча зрабіць расійскай. Як справа выйшла на людзі, начальства мусіла рэагаваць: Герашчанку прапанавалі звольніцца з аблвыканкама. А, пакуль тое, пакрыўджаны чыноўнік раздае новыя інтэрв’ю. І ў іх ужо гучаць словы пра тое, што Расія мусіць звяртаць больш увагі на «миллионы русских», якія жывуць на «сопредельных территориях». Заўважце, не ў незалежных дзяржавах — на тэрыторыях.

Але рэальныя перспектывы яго руху ў Беларусі — смеху вартыя. Сябры прарасійскага «Рускага дома» адразу ж выйшлі з яго, як толькі ім прапанавалі звальняцца з цёплых месцаў у дзяржструктурах. Параўнайце з настаўнікамі Міншчыны, якія, рызыкуючы працай, засталіся ў дэмакратычных партыях.

Усё ж беларускія грошы Герашчанку і Со даражэйшыя за «русскую идею».

**Сяргей Мікулевіч**

БЕЗ КАМЕНТАРОЎ

## Сакавітая эротыка ад Чаргінца

Вось што піша старшыня дзяржаўнага Саюза пісьменнікаў, які стварыў і ўзначаліў камісію па маральнасці. Урывак з рамана «Тайна Авальнага кабінета». Героі — прэзідэнт ЗША Джон Макоўлі, першая лэдзі Сара Макоўлі і практыкантка з пазнавальным прозвішчам Моніка Левін. Цытаты падаюцца на мове арыгінала.

«Чуть полноватое тело было стройным, живот подтянут, груди как два полных комка. Она двигалась к нему, покачивая бедрами, а он с удовольствием откровенно рассматривал каждую часть ее нежного тела. Макоули лег поудобнее на спину. Она поняла, что он хочет, и, присев на корточки, начала целовать его шею, грудь, живот, бедра... Гимеев нож Джона готов был лопнуть от приятного напряжения,и он тихо сказал: «Ты — сверху!» (С. 58.)

## Быць віцэ-прэзідэнтам проста! Нічога не робіш

Пасля Джорджа Буша амерыканская прэса, здаецца, знайшла чарговы аб’ект для кпінаў. Намеснік прэзідэнта ЗША, Джо Байдэн, распавядаючы пра свае адчуванні на другой паводле значнасці пасадзе ў магутнай дзяржаве, сказаў даслоўна наступнае: «Быць віцэ-прэзідэнтам — гэта проста. Нічога не робіш». Словы Байдэна былі запісаныя выпадкова. Памочнікі заспяшаліся заявіць, што Байдэн пажартаваў.

**ЛК**

# На галаве папаха, на грудзях надпіс «ЗаКолю!»

Працяг са старонкі 1.

Задача каманды Ліпковіча — сабраць 150 подпісаў выбарцаў, каб атрымаць дазвол на ўдзел у выбарах. А дзе збіраць подпісы, як не ў студэнцкіх інтэрнатах? Балазе, ў Валгаградскай выбарчай акрузе размешчаны комплекс інтэрнатаў Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Інтрыга ў тым, што выставіць кандыдатуру на мясцовых выбарах збіраецца і Мікалай Казаровец, рэктар БДАТУ. Яны з Ліпковічам — канкурэнты.

### Аб’ект нерэжымны

«Аб’ект нерэжымны, закон дазваляе збіраць подпісы!» — ідуць у наступ Яўген Ліпковіч і яго давераная асоба Марк Бернштэйн на загадчыцу інтэрната БДАТУ №7 Святлану Бакуновіч. «Вы ведаеце, у нас ёсць дырэктар студмястэчка, ён павінен даць дазвол», — адбіваецца загадчыца. «Дырэктар студмястэчка павінен даць мне дазвол на маё канстытуцыйнае права?» — абураецца Ліпковіч. «Дык мы таксама збіралі подпісы... — неабачліва кажа жанчына. — Два разы яны ж не могуць сабраць». «Лёгка! Закон дазваляе любому чалавеку падпісацца хоць за пяць кандыдатаў, — пярэчыць Ліпковіч. — Калі вы збіралі подпісы, значыцца ён ужо даваў дазвол!» «Хто?» — пытаецца канчаткова збітая з панталыку загадчыца. «Начальнік. А вы былі сябрам ініцыятыўнай групы, калі збіралі подпісы?» — насядае Ліпковіч. «Так», — няўпэўнена адказвае загадчыца, падазраючы няладнае. «Пакажыце!» — кандыдат і яго памочнік разглядаюць яе пасведчанне. «Ну вось бачыце, што выходзіць — аднаму кандыдату можна збіраць подпісы, а іншаму — нельга!» — хорам лямантуюць Бернштэйн і Ліпковіч. Узнімаецца вэрхал. Ліпковіч цягне да сябе стос сабраных за рэктара подпісаў, загадчыца не аддае паперы з крыкам, што ніякіх подпісаў ніхто не збіраў. Хаос! У такіх умовах Ліпковіч пачуваецца як рыба ў вадзе.



У сваім блогу Ліпковіч змясціў калаж: «Наталлю Пяткевіч вязуць у Мінгарвыканкам узгадняць інфармацыйны постар Ліпковіча Я.А.»

### А пасля кампутары прападаюць

«Выходзіць яшчэ цікавей, чым мы думалі, — задаволена кажа Ліпковіч, ідучы па калідоры. — Тут ужо сабралі подпісы, а нас не пускаюць». «Як цікава, — дадае Марк Бернштэйн, — рэктар збірае подпісы ў сваіх студэнтаў і наўрад ці ён пытаўся пры гэтым дазволу ў дырэктара студмястэчка!»

Праз чвэрць гадзіны Ліпковіч ужо ўрываецца ў кабінет намесніцы дырэктара студмястэчка БДАТУ Ірыны Лукашэвіч. Голасам педагога са стажам тая раіць яму звярнуцца па дазвол на збор подпісаў да рэктара ці прарэктара: «Вам дадуць чалавека нашага, які будзе з вамі хадзіць. Гэта ж не так проста: сёння вы ініцыятыўная група, заўтра яшчэ збярэцца. Нават па тэлевізары колькі кажуць: не пускайце незнаёмых людзей!» «Секундачку, — перапыняе яе Ліпковіч, — разумееце, існуе маральная калізія. Рэктар ваш ідзе па гэтай жа выбарчай акрузе. І я павінен у вашага ж рэктара атрымліваць дазвол на збор подпісаў?» «А калі крадуць маніторы, калі крадуць кампутары, хто нясе адказнасць? Рэктар!» — аргументуе тая. «Калі ў іх нешта крадуць, хай звяртаюцца ў міліцыю. Я тут пры чым?» — абураецца Ліпковіч, кіруючыся ў выбарчую камісію, каб скласці скаргу. У выніку — чарговая перапалка з чыноўнікамі. І так — дзень у дзень.

### «ЗаКолю!»

Цяпер Ліпковіч спрабуе афіцыйна зацвердзіць у Адміністрацыі прэзідэнта свой інфармацыйны постар, на якім — фота кандыдата на тле Нацыянальнай бібліятэкі. На галаве папаха, на грудзях надпіс «ЗаКолю!»

Ліпковіч кажа, што яго намер балатавацца «вельмі сур’ёзны». Месцамі, аднак, яго перадвыбарчая кампанія нагадвае вялікі жарт ці мастацкі хэпенінг. Магчыма, тут ёсць доля праўды: 1 сакавіка ў сталічнай галерэі «Ў» адчынілася «Выстава падарункаў кандыдату ў кандыдаты па Валгаградскай выбарчай акрузе № 54 Ліпковічу Я.А.». Зрэшты, Ліпковічу сапраўды ёсць што выставіць — на сценах яго кватэры вісяць палотны Уладзіміра Цэслера, Сяргея Малішэўскага, графіка Наталлі Паваляевай, здымкі Ядзі Адамчык. Ліпковіч тусуецца са сталічнай мастацкай багемай не адзін дзясятак гадоў.



Загадчыцу інтэрната БДАТУ №7 Святлану Бакуновіч Ліпковіч увагнаў у ступар.

Праблема чыноўнікаў у тым, што яны не разумеюць, як успрымаць Ліпковіча — як сур’ёзную небяспеку ці як хамаватага блазна. Ліпковіч расійскамоўны, з партыямі не звязаны. На першы погляд — не апазіцыя. Значыцца, трэба да чалавека прыслухоўвацца — на ўсякі выпадак. Ён жа і вышэй паскардзіцца можа, як гэта было ў выпадку з кефірам. А скардзіцца Ліпковіч любіць! Карацей, для Першамайскай раённай выбарчай камісіі такі кандыдат — спрэс непрыемнасць. А вось калі б такіх ліпковічаў балатавалася чалавек з дзесяць, гэта была б ужо праблема ў маштабах сталіцы.

Сам Ліпковіч кажа, што на парламенцкіх выбарах яму, бадай, такой вольніцы не далі б. А тут выбары мясцовыя, кантроль не дужа вялікі — ёсць прастора для дзеяння.

«Калі б выбары праходзілі ў інтэрнэце, я б перамог і зрабіўся прэзідэнтам», — кажа ён. Калі выбары ператварыліся ў абсурд, то Ліпковіч здолеў ператварыць абсурд у фарс. А гэта, як мінімум, не так сумна.

**Алесь Кудрыцкі**

Адрас блогу Яўгена Ліпковіча: http://lipkovich.livejournal.com

# Ператрус у хаце шэф-рэдактаркі «Народнай волі»

Адкруцілі нават заднюю сценку пральнай машыны.

26 лютага ўвечары ў Святланы Калінкінай сканфіскавалі кампутары і флэшкі. У паперах следчых яна фігуравала як выпускаючая рэдактарка сайта «Хартыя-97».

Мяркуючы з прад’яўленай супрацоўнікамі праваахоўных органаў паперы, агляд кватэры журналісткі праводзіўся ў звязку са справай-водгуллем так званай «паляўнічай справы».

«Паляўнічая справа» — гэта працэс чатырох высокапастаўленых супрацоўнікаў міліцыі ў Гомельскай вобласці, якія нібыта злоўжывалі службовым становішчам, у прыватнасці, незаконна палявалі. Акрамя таго, іх вінавацілі ў незаконным ціску на супрацоўнікаў КДБ. Вярхоўны суд прызнаў вінаватымі па гэтай справе былых міліцыянтаў Ермакова, Мінянкова і Баранава, а міліцыянта Малаева амніставаў.



Тым часам былы старшыня Гомельскага УКДБ, а цяпер — Гродзенскага КДБ, генерал Іван Корж падаў пазоў на сваякоў абвінавачаных, якія нібыта ўзвялі на яго паклёп.

Артыкул аб той справе, у якім кадэбістаў вінавацілі ў падтасоўцы фактаў, з’явіўся ў свой час у інтэрнэце — у прыватнасці, на сайтах «Белорусский партизан» і «Хартыя-97».

Па гэтай падсправе былі дапыталі і ператрэслі іншую журналістку «Народнай волі» — Марыну Коктыш. На допыт былі выклікалі каардынатара ініцыятывы «Хартыя-97» Андрэя Саннікава. Цяпер вось чарга дайшла да Святланы Калінкінай. Рэдкі выпадак: абшукалі кватэру журналісткі.

«Для мяне гэты ператрус быў нечаканым, — кажа Святлана Калінкіна. — Чамусьці я фігуравала ў паперах, якія мне ўчора паказалі, як выпускаючая рэдактарка сайта «Хартыя-97». Я даўняя чытачка гэтага сайта, але ніколі не мела дачынення да яго выпуску. Перакапалі ў мяне ўсё. Шукалі грошы, здымалі на відэа. Адкруцілі нават заднюю сценку пралкі».

Святлана Калінкіна мяркуе, што «не так пакрыўдзіўся той Іван Корж, як гэта стала нагодай для запалохвання журналістаў, каб знайсці крыніцы, якімі карыстаюцца незалежныя журналісты і каб, наогул, адбіць ахвоту ў журналістаў кранаць тэму КДБ і ўладных структураў».

**Сяргей Гезгала**

# Ветэраны «абурыліся» назвай сайта «Беларускі партызан»

Газета «Рэспубліка» апублікавала ліст за подпісам старшыні Савета Мінскай абласной арганізацыі ветэранаў Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў, ганаровага грамадзяніна Мінскай вобласці Аляксандра Слабады.

У лісце гаворыцца, што «ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Мінскай вобласці глыбока абураныя блюзнерскім выкарыстаннем у назве недзяржаўнага электроннага СМІ святых для нас словаў «Беларускі партызан».

Выкарыстанне ў назве сайта словазлучэння «Беларускі партызан», па словах Слабады, «абражае ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны тым, што правакацыйныя матэрыялы, якія размяшчаюцца ў інтэрнэце пад гэтым загалоўкам, носяць ярка выяўлены, перадузяты, адкрыта антыбеларускі характар».

Як піша аўтар ліста або пішуць за яго: «Рэдакцыя гэтага СМІ дае трыбуну так званым «незалежным палітыкам» і «экспертам», якія жывуць побач з намі на беларускай зямлі і пры гэтым не саромеюцца абліваць брудам народ Беларусі, яго кіраўніцтва, свядома ігнаруюць поспехі, дасягнутыя за гады існавання Рэспублікі Беларусь, і ставяць знак роўнасці паміж словамі «партызан» і «апазіцыянер».

Вось як пракаментаваў ліст ветэранаў адзін са стваральнікаў сайта Павал Шарамет: «У гады вайны мая прабабуля была сувязной партызанскага атрада і захоўвала дома сцяг дывізіі Чырвонай арміі. Яе здала паліцаям суседка. Прабабулю павесілі фашысты, і яе імем названая вуліца ў горадзе Асіповічы. Яе сын Мікалай — мой дзед — быў байцом партызанскага атрада. Мой другі дзед Станіслаў, афіцэр Чырвонай арміі, прайшоў праз канцлагер, збег, таксама партызаніў.

На жаль, іх даўно няма з намі. Я вельмі люблю сваіх дзядоў і часта ўзгадваю іх добрыя вочы і мудрыя парады. Сапраўдных ветэранаў засталося мала, пра іх трэба клапаціцца, таму спадара А.І. Слабаду я вельмі прашу не нервавацца і паберагчы здароўе, таму што ў беларускай дзяржаве хапае больш важных праблемаў, чым вайна супраць сайта «Беларускі партызан».

**СГ**

# Беларускае золата

Алімпіяда ў Ванкуверы стала самай паспяховай для нашай краіны.

Ніколі раней беларусы не бралі залатых медалёў на зімовых Алімпіядах. Былі срэбры, бронзы, а вось на вяршыню п’едэстала забірацца не ўдавалася.

На гэтых Гульнях спадзяванні былі звязаныя з фрыстайлам. А найперш з Антонам Кушніром, які выйграваў у сезоне амаль усе старты. Кушнір зваліўся, згубіў лыжы і ў фінал не трапіў.

Увага пераключылася на Дзмітрыя Дашчынскага. У двухразовага прызёра Алімпіяд (Нагана і Турын) была вельмі складаная праграма. Але ўжо пасля першага скачка стала ясна — медаля Дзмітры не возьме. Ён няўдала прызямліўся і заняў апошняе месца. Другая спроба была выкананая амаль бездакорна, але гэтага было замала.

Аляксей Грышын затое пасля першага скачка займаў другую пазіцыю, але шчыльнасць вынікаў уражвала. На Грышына, нягледзячы на ўвесь ягоны каласальны досвед, мала хто разлічваў.

У другой спробе проста фантастычны скачок атрымаўся ў амерыканца Джэрэта Петэрсана. Такога ў свеце не робіць амаль ніхто. Суддзі не пашкадавалі адзнак. І амерыканец займаў першае месца.

Але ў той вечар 30-гадовы Аляксей Грышын быў неперажным. Ягонае эфектнае выкананне тры з чатырма з двума вінтамі ў апошнім сальта не пакінула абыякавым суддзяў. Беларус усяго крыху больш на бал апярэдзіў Петэрсана.

Яшчэ заставалася спроба ў канадца Нісэна, але Аляксей зразумеў, што ён стаў алімпійскім чэмпіёнам яшчэ тады, калі гаспадар Алімпіяды заходзіў на трамплін. Занадта сагнуў ногі канадзец — ён толькі пяты.

«Я адчуў, што гэта мой дзень, і ўсё ў мяне ўдасца», — скажа потым першы беларускі зімовы алімпійскі чэмпіён.

## Турбуюць грыжы

Ужо на прэс-канферэнцыі па выніках выступлення Грышын зазначыў, што цяпер ягоная галоўная мара — дзіця. Ён расказаў, што такое самае «Yes!», як пасля алімпійскага золата, выгукаў толькі аднойчы, калі будучая жонка Ірына пагадзілася выйсці за яго замуж.

Спорт — не адзіны занятак Грышына. Ён таксама валодае невялікай фірмай «Аквафрыстайл», што займаецца рыбным бізнэсам. Аляксей кажа, што такім чынам ён закладвае падмурак да свайго жыцця пасля спорту.

Зрэшты, развітвацца з фрыстайлам Аляксей не спяшаецца. Хоць са здароўем усё не вельмі добра. Апошняе абследаванне паказала, што ў Аляксея ажно дзевяць спінных грыж — прафесійная хвароба фрыстайлістаў. Тая ж праблема і ў Дзмітрыя Дашчынскага.

А Ала Цупер у жанчын увогуле выступала ў фінале са зламанай лапаткай. Яна нават не магла падняць адну руку ўверх, каб павітаць заўзятараў. Тым не менш, ёй удалося заняць восьмае месца.

Асоль Слівец спынілася ў кроку ад п’едэстала. Яна чацвёртая. Тым не менш, Асоль не надта засмуцілася свайму «драўлянаму медалю». У гэтым сезоне, пасля нараджэння дзіцяці, так добра дзяўчына яшчэ не скакала.

Трэ было бачыць, з якімі эмоцыямі Асоль падтрымлівала роднага брата Цімоха ў мужчынскім фінале, — ён дзявяты.

## Трэнер Захараў: У канадцаў мазгоў не хапае

Хакей, напэўна, самае вялікае засмучэнне беларусаў на ванкуверскай Алімпіядзе. І тут у разлік бярэцца не толькі выступ зборнай, якая прайграла па булітах швейцарцам і не прайшла ў чвэрцьфінал, але і паводзіны галоўнага трэнера Міхаіла Захарава.

Пасля паразы беларусаў Швейцарыі Захараў даў волю эмоцыям. Гаварыў без аглядкі на этыкет і прыстойнасць, як часта робіць.

«Усе ў шоку ад нашай гульні, ад яе прыгажосці. Спытайце любога трэнера канадскага ці яшчэ каго. Ніводны з іх не сказаў, што мы дрэнна гуляем. Бенгт-Оке Густафсан [трэнер зборнай Швецыі — «НН»] мяне пяць разоў павіншаваў. А добразычліўцы ў нашай краіне знойдуцца заўсёды ...На чэмпіянаце свету ў Германіі Беларусь будзе ў прызёрах», — заявіў Захараў.

А потым зноў падзяліўся сваімі сімпатыямі. «На Алімпіядзе балею толькі за Расію. Я сам адтуль (Захараў нарадзіўся ў 1962 г. у горадзе Усць-Каменагорск (Казахстан). Трэба ўсім даказаць, што наш хакей найлепшы ў свеце. А ў канадцаў зусім не працуе галава, у іх мазгоў не хапае. Яны нават каляндар не змаглі нармальна скласці. Думалі яны будуць першыя, а ў выніку самі трапілі ў гэта г... Буду вельмі рады, калі яны прайграюць. Буду самым шчаслівым чалавекам на Зямлі», — пахамску заявіў Захараў.

Самым шчаслівым чалавекам на планеце Захараў не стаў. У чвэрцьфінале расіяне былі жорстка бітыя ўсё тымі ж «бязмозглымі» канадцамі — 3:7. Каманда з «Краіны кляновага ліста» заваявала золата, перамогшы ў фінале ЗША — 3:2.

У сваёй нястрыманасці і брыдкаслоўі Захараў нечым кагосьці нагадвае. Заўзятары ж пачынаюць збор подпісаў, каб гэты трэнер не кіраваў зборнай на чэмпіянаце свету. І шкадуюць аб адстаўцы Глена Хэнлана, які быў усеагульным любімцам.

**Зміцер Панкавец**

# Аляксей Грышын: Не выйшаў гімнастам, стаў фрыстайлістам

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: Спортам займаюцца мільёны. А перамагаюць толькі адзінкі. У чым сакрэт перамог?**

**АГ:** Я не думаю, што ёсць нейкая ўніверсальная формула. Усе людзі розныя, іхнія перамогі таксама розныя. Мне здаецца, што галоўным фактарам усё ж з’яўляецца імкненне да перамогі. Трэба навучыцца ставіць перад сабой канкрэтныя задачы і выконваць іх.

**«НН»: А якая думка пранеслася ў галаве пасля перамогі ў Ванкуверы?**

**АГ:** Адзінае, аб чым падумаў, што збылася мая мара. Тая, да якой я ішоў на працягу многіх гадоў. Адчуў сябе шчаслівым чалавекам.

**«НН»: А перад стартам верылі ў перамогу?**

**АГ:** Я ехаў на Алімпіяду па золата. У нашым відзе спорту шмат што залежыць ад суб’ектыўных фактараў — ад суддзяў, ад надвор’я. Тым не менш, быў упэўнены ў перамозе.

**«НН»: У адным з інтэрв’ю Вы прызналіся, што пакутуеце ад спіннной грыжы. Дакладней, ад дзевяці грыжаў. Гэта прафесійная хвароба фрыстайлістаў?**

**АГ:** Так. Абсалютна ва ўсіх фрыстайлістаў траўмаваныя спіна і калені. Дзякуй Богу, што спіна ўжо не турбавала мяне цэлы год. Горш не становіцца, і тое добра. Я настроены змагацца за самыя высокія месцы і на Алімпіядзе ў Сочы.

**«НН»: А чаго цяпер хочацца найбольш?**

**АГ:** Проста адпачыць.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Мама фрыстайліста Грышына сустрэла яго ў аэрапорце з 4-кілаграмовым тортам.**

| Медальны залік | золата | срэбра | бронза | агулам |
|---|---|---|---|---|
| 1. Канада | 14 | 7 | 5 | 26 |
| 2. Нямеччына | 10 | 13 | 7 | 30 |
| 3. ЗША | 9 | 15 | 13 | 37 |
| 4. Нарвегія | 9 | 8 | 6 | 23 |
| 5. Паўднёвая Карэя | 6 | 6 | 2 | 14 |
| 6. Швейцарыя | 6 | 0 | 3 | 9 |
| 7. Кітай | 5 | 2 | 4 | 11 |
| 8. Швецыя | 5 | 2 | 4 | 11 |
| 9. Аўстрыя | 4 | 6 | 6 | 16 |
| 10. Нідэрланды | 4 | 1 | 3 | 8 |
| 11. Расія | 3 | 5 | 7 | 15 |
| 12. Францыя | 2 | 3 | 6 | 11 |
| 13. Аўстралія | 2 | 1 | 0 | 3 |

| Медальны залік | золата | срэбра | бронза | агулам |
|---|---|---|---|---|
| 14. Чэхія | 2 | 0 | 4 | 6 |
| 15. Польшча | 1 | 3 | 2 | 6 |
| 16. Італія | 1 | 1 | 3 | 5 |
| 17. БЕЛАРУСЬ | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 17. Славаччына | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 19. Брытанія | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 20. Японія | 0 | 3 | 2 | 5 |
| 21. Славенія | 0 | 2 | 1 | 3 |
| 21. Харватыя | 0 | 2 | 1 | 3 |
| 23. Латвія | 0 | 2 | 0 | 2 |
| 24. Фінляндыя | 0 | 1 | 4 | 5 |
| 25. Казахстан | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 26. Эстонія | 0 | 1 | 0 | 1 |

# Дзе вывучыцца на зорку фрыстайла?

Фрыстайл (ад ангельскага free style — вольны стыль) — малады від спорту. Уключае ў сябе акрабатыку (скокі з акрабатычнага трампліна) і могул (спуск па бугрыстай трасе і выкананне двух акрабатычных скокаў). У сучасным варыянце фрыстайл з’явіўся ў 1971 годзе на першых афіцыйных спаборніцтвах у Нью-Гемпшыры (ЗША). Да гэтага часу фрыстайл, або лыжны балет, існаваў толькі як віртуознае цыркавое шоу на гарналыжных курортах.

Калі вашае дзіця хоча стаць зоркай фрыстайла, то першапачаткова неабходна мець добрую фізічную падрыхтоўку, а потым прайсці спецыяльную фізпадрыхтоўку: скокі на батуце, з воднага трампліна і, непасрэдна, могул. У некаторых выпадках у фрыстайл пераходзяць пасля гімнастыкі.

Напрыклад, Ала Цупер з чатырох гадоў займалася гімнастыкай, аднак, калі ў 13 гадоў трэнеры сказалі, што ў гімнастыцы зорак з неба ёй не схапіць, то прапанавалі перайсці ў фрыстайл. Пакуль Ала Цупер перавучвала сальта і вінты з улікам лыжнай акрабатыкі, то трэніроўкі спадабаліся і фрыстайл стаў асноўным відам спорту.

Школаў, куды можна аддаць дзіця на заняткі фрыстайлам, усяго дзве: у Мінску і Гомелі. І толькі ў мінскай ёсць такая раскоша, як снежны схіл — «Раўбічы».

СДЮШАР па акрабатыцы і фрыстайле Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту Мінадукацыі: Мінск, пр.Пераможцаў, 2, тэл.: (17) 203-84-95, час працы: 8:30—17.30.

ДЮСШ №7, Гомель, вул.Ленінградская, 39а, +(232) 23-31-28.

**Настасся Шамрэй**

# Паэт без гальштука

**Раю нашаму слаўнаму паэту Леаніду Дранько-Майсюку дысцыплінаваць фантазію. Піша Уладзімір Арлоў.**

Адной з самых змястоўных публікацый першага нумара новага літаратурна-мастацкага часопіса «Верасень», на мой погляд, з'яўляецца інтэрв'ю Леаніда Васільевіча Дранько-Майсюка, надрукаванае пад някідкай паэтычнай назвай «На сцэне трэба чытаць змястоўныя вершы, а не рваць газеты».

Маладыя чытачы і літаратурная моладзь, якім найперш адрасаваны часопіс, даведваюцца з вуснаў мэтра шмат цікавых і карысных рэчаў: як робяцца пісьменнікамі, як трэба шукаць сваё непаўторнае слова, як трымацца на сцэне (гл. назву інтэрв'ю) etc. З парадамі юным творцам суседнічаюць развагі Леаніда Васільевіча над такімі складанымі і балючымі з'явамі айчыннай літаратуры, як вядомы верш Андрэя Хадановіча «Хлопчык і копчык», каляндар з агаленымі калегамі альбо паэтычныя слэмы. Дарэчы, апошнім Дранько-Майсюк даў бліскучую і вычарпальную характарыстыку: «А слэм — і ўсялякія там роднасныя яму перфомансы — выходзіць за межы мастацтва, за межы паэзіі і здаровага сэнсу». Належнае аддаецца ў інтэрв'ю і словатворчасці, у прыватнасці, абгрунтаванаму вынайдзеных самім паэтам слоў «далькажык» (замест «мабільніка») або «выход» (замест «прынтара», які ў не зусім свядомых колах даўно завецца «друкаркай»).

Зрэшты, як заўважыў калісьці Фрыдрых Ніцшэ, «усё жыццё і ёсць спрэчкай пра густы». Камусьці даспадобы «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, а камусьці «Вам — задание» Мікалая Чаргінца.

Адказваючы на вясёлае і дасціпнае пытанне, ці не быў ён у мінулым жыцці ваўком, Леанід Васільевіч робіць надзвычай сур'ёзную выснову (з якой наўрад ці пагадзіўся б, да прыкладу, Ян Баршчэўскі): «Мы, беларусы, у аснове сваёй глядзім на жыццё дастаткова цвяроза, дастаткова рацыянальна. Калі нешта ўспамінаем, то ўспамінаем тое, што было. Рэальна было». З прычыны, якую чытач зразумее крыху пазней, тут я мушу паставіць NB.

Відаць, таму, што якраз цяпер пішу працяг сваёй дзіцячай кніжкі «Адкуль наш род», у інтэрв'ю Дранько-Майсюка мяне найперш прывабіла пытанне: «Якім вы былі ў дзяцінстве?» Адразу згадаліся ўласныя дзіцячыя гады, незабыўная бабуля Аўгіння, што вучыла не спаць, калі сонца сядае, і не глядзецца ў люстэрка апоўначы — бо растанеш у ім, як солі драбінка ў студні, а таксама не хлусіць, бо пачуе святы Мікола з абразоў і будзеш сікацца ўначы...

Леанід Васільевіч у дзяцінстве быў «паслухмяным, уважлівым, не рабіў шкоду», «любіў слухаць беларускае радыё», асабліва радыёспектаклі паводле твораў беларускіх пісьменнікаў, якія яму «здаваліся лепшымі людзьмі на свеце!» Далей дзяцінства было чамусьці забытае, і думка паэта зрабіла круты віраж. Перапрашаю за доўгае цытаванне, але без яго абысціся тут немагчыма: «На жаль, з надаўнягa часу ўсталявалася мода здзекавацца з класічных твораў і з саміх класікаў. Я гэта ўспрымаю як асабістую абразу.

Колькі гадоў таму шырока друкаваліся фрагменты аднаго дзённіка, у якім апаганены лепшыя нашы літаратары. Уладзімір Арлоў усклікнуў: «Які цудоўны дзённік!» і надрукаваў свой радасны водгук у «Нашай Ніве». Тое, што былі зняважаны Максім Танк і Пімен Панчанка, Янка Брыль і Васіль Быкаў, Мікола Аўрамчык і Генадзь Бураўкін, Іван Навуменка і Васіль Зуёнак, Вольга Іпатава і Аляксей Дударaў, Уладзімір Някляеў і Уладзімір Ягоўдзік — для Арлова радасць».

Паводле іроніі лёсу, інтэрв'ю я чытаў за сталом, дзе ляжалі новыя старонкі ўжо згаданай маёй кніжкі «Адкуль наш род». На гэтых старонках апавядалася якраз пра Васіля Быкава, Янку Брыля ды іхніх маладзейшых калегаў, пра якіх я пісаў ужо ў кнізе «Імёны Свабоды». Паколькі было яшчэ далёка да поўначы, я падышоў да люстэрка. На мяне глядзеў чалавек, які ніколі не друкаваў у «Нашай Ніве» ні радасных, ні сумных водгукаў на чые-небудзь дзённікі. У галаў палез Борхес — Тлён, Укбар, Orbis Tertius...

Заставалася загадкай і тое, чаму ў інтэрв'ю не названы аўтар дзённіка — відаць па ўсім, не толькі страшэнны вораг беларускай літаратуры, але і чалавек надзвычай акрутны і помслівы, з якім Дранько-Майсюк, так бы мовіць, абачліва вырашыў не звязвацца.

Пасля размовы з Леанідам Васільевічам праз «далькажык» удалося высветліць, што «адзін дзённік» належыць пяру Вячаслава Адамчыка — між іншым, класіка нашай літаратуры, аўтара «Чужой бацькаўшчыны» і выдатных апавяданняў. На просьбу даць дакладную спасылку на публікацыю водгуку і працытаваць мае словы, паэт з годнасцю адказаў, што падчас інтэрв'ю газеты пад рукамі не меў і цытаваў па памяці. Як казалі ў старажытнасці, quod licet Jovi...

Яшчэ праз некалькі дзён Дранько-Майсюк усцешана паведаміў, дзе друкаваўся мой водгук, альбо, згадаўшы словы самога Леаніда Васільевіча, «успомніў тое, што было. Рэальна было».

...Каб назваць эсэ «Крыжы Монтэнэгра», прысвечанае падарожжу ў Чарнагорыю, водгукам на дзённік Вячаслава Адамчыка, трэба мець, далікатна кажучы, буйную фантазію. Але рэч нават не ў гэтым, а ў тым, што ў маім эсэ (ягоны герой па дарозе да мора сярод іншых заняткаў чытае і вышэйзгаданы дзённік) вы не знойдзеце ні цытаванага Дранько-Майсюком і растыражаванага «Верасенем» майго «радаснага ўскліку», ні, наогул, якіх-небудзь слоў, якія б сведчылі пра «радасць» з нагоды таго, што «апаганены лепшыя нашы літаратары», пералічаныя ў інтэрв'ю. Пераканацца ў гэтым можна даволі проста: або знайсці падшыўку «НН» сямігадовай даўніны і разгарнуць 48-мы нумар за 2003 год, або ўзяць у рукі кнігу «Сланы Ганібала» (Мінск, 2005), дзе таксама змешчаныя «Крыжы Монтэнэгра». (Дарэчы, рызыкну выказаць крамольную думку, што Вячаслаў Адамчык пісаў свой дзённік не каб кагосьці «апаганіць», а з нейкай іншаю мэтай.)

На пытанне, ці любіць ён насіць гальштук, Леанід Васільевіч у інтэрв'ю адказаў: «...здаецца, люблю. Дубоўка, Жылка, Змітрок Бядуля, Міхась Чарот, іншыя нашы слаўныя паэты насілі гальштукі. І мне гэта заўсёды падабалася. Гальштук дысцыплінуе».

Няблага сказана. І таму раю нашаму слаўнаму паэту Дранько-Майсюку павязаць гальштук, дысцыплінаваць сваю фантазію і адказаць на пытанне, дзеля чаго на яе крылах ён заляцеў так далёка. І ад паэзіі, і ад праўды.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Тыдзень французскага кіно

**Ад 9 да 14 сакавіка ў мінскім кінатэатры «Цэнтральны»** пройдзе Тыдзень французскага кіно, арганізаваны пры падтрымцы пасольства Францыі. Тыдзень адкрыецца **9 сакавіка ў 18.30** камедыяй **«Нуль»** (2006). Фільм таксама будзе паказаны **11 сакавіка а 21.00. 10 сакавіка ў 19.00** і **12 сакавіка ў 21.00** будзе прадстаўлена камедыя **«Чужынцы»** (1993). **10 сакавіка ў 21.00** і **11 сакавіка ў 18.30** будзе дэманстравацца драма **«Асалода — Паломa»** (2007) рэжысёра Надзіра Макнеша. Карціна заслужыла французскую кінапрэмію братоў Люм'ер за «найлепшы фільм на французскай мове» (Парыж, 2008). **9 сакавіка ў 21.00** і **12 сакавіка ў 19.00** гледачам прадставяць камедыю **«Берні»** (1996). **13 і 14 сакавіка ў 14.30** будзе паказаны анімацыйны фільм **«Кірыку і чараўнічка»**.

**БелаПАН**

РГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» арганізуе бясплатныя заняткі па беларускай мове і гісторыі для школьнікаў 7-х — 9-х класаў. Заняткі праводзяць вядомыя педагогі, кандыдаты навук, выдатнікі адукацыі Беларусі.

**Арганізацыйны сход — 17.03.2010 г. (серада) у памяшканні ТБМ (Мінск, вул. Румянцава, 13, каля ст.метро «Плошча Перамогі»).** Вучні 7-х—8-х класаў збіраюцца **ў 16.30**, вучні 9-х класаў — **у 17.15**. Даведкі праз тэл.: 284-85-11.

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

### Лукашэнка і прастатыт

**На тым тыдні стала вядомая магчымая прычына таямнічай паездкі Лукашэнкі ў Швейцарыю.** Еўрасаюзаўскі дыпламат паведаміў, што, згодна з іх інфармацыяй, кіраўніку Беларусі рабілі аперацыю на прастаце. Інфармацыя разлягаецца праз інтэрнэт. От, там ужо назласлівілі.

У тым, што Лукашэнка ездзіў лячыць прастату, ніякага сораму няма. Тысячы мужчын у яго веку пакутуюць ад гэтага. Пытанне ў іншым: колькі беларусаў маюць магчымасць лячыцца ў Швейцарыі? Маюць грошы аплаціць аперацыю, нават самую мізэрную, у швейцарскай клініцы, знаходжанне там і дарогу?

Ці зарабляе кіраўнік дзяржавы дастатковыя для гэтага сродкі? У інтэрв'ю расійскаму тэлеканалу ТВЦ ён неяк сказаў, што ён мае месячны аклад каля 1200 даляраў. Падобная аперацыя і пяцідзённае знаходжанне, скажам, у швейцарскай клініцы Группы Хірсландэн выльецца ў суму ад 30 тысяч даляраў. Тээрэтычна, кіраўнік дзяржавы можа столькі назбіраць. Або напазычаць у міністраў, якія, паводле яго словаў, маюць аклады ў 800 даляраў штомесяц.

І ўсё ж, калі гэта была паездка на лячэнне, чаго ж тады прэс-служба прэзідэнта і дзяржаўныя СМІ трубілі пра «афіцыйны візіт», «працоўныя сустрэчы»? Ці значыць гэта, што грамадзянін Лукашэнка з'ездзіў за дзяржаўныя грошы па сваіх прыватных патрэбах?

Пытанне на пытанні... Казалі б праўду, як ёсць, як, можа, людзі болей ім верылі б.

**Аляксандр Хіла, Маладзечна**

### Крама «праз дарогу», або Як я наведаў Нацыянальную бібліятэку

**Нарэшце вырашыў наведаць Нацыянальную бібліятэку ў нашым горадзе-героі Мінску.** Хацелася завершыць гештальт, які не даваў у поўнай меры адчуць сябе беларусам.

Хадзілі чуткі, што падчас будаўніцтва ад няшчасных здарэнняў загінула каля трыццаці чалавек. Але гэтую інфармацыю стойбала дзяржаўная прапаганда, якая на пэўны час вынайшла новую беларускую ідэю ў будаўніцтве гіганцкай бібліятэкі.

Мая сяброўка Алена аж затопала ножкамі ад радасці, калі я прапанаваў паглядзець на Мінск з вышыні птушынага палёту. Мы захапілі з сабой яшчэ і маю стрыечную сястру Тацяну.

У чарзе па квіткі маю ўвагу прыцягнулі два памятыя хлопцы, год па 25 кожны. Яны сталі перада мной і гучна размаўлялі. Адзін быў апрануты ў белы касцюм фірмы «Найк». Праўда, белы ён быў адносна: увесь мяты і ў брудных плямах. Нібы хлопец качаўся ў ім па зямлі, а потым яшчэ і спаў. Голеная галава, плаваючы погляд і мяшкі пад вачыма складалі аб ім дрэннае ўражанне. Другі быў на пагалавы вышэйшы за першага, з нечасанымі валасамі, адколатым па дыяганалі пярэднім зубам, сіпаватым гучным голасам і таксама памятым прыкідам. Ад абодвух ішоў пах таннага віна.

— Ого! — выгукнуў лысы. — Пяць тысяч за бінокаль. Адурэлі. Я пайду дзве бутэлькі віна куплю, чым буду плаціць стока».

Пасля гэтай заўвагі абодва гучна рассмяяліся.

«Нада бы выпіць. Дзе тут магазін бліжні? Ты не замеціў?»

«Неа», — адказаў другі з адколатым па дыяганалі зубам.

На маю бяду, лысы абярнуўся і, ацэньваючы, акінуў мяне сваімі прыпухшымі вачыма.

— Ты з Мінску?

— Не, я з Магілёва.

— Гы-гы! А мы с Гродна, — адказаў хлопец з паколатым па дыяганалі зубам.

— А можат знаеш, гдзе тут бліжайшы магазін? — запытаў мяне ў чарговы раз лысы.

— Праз дарогу, — адказаў я пабеларуску, як і заўсёды адказваю, калі да мяне звяртаюцца.

— Гы! Праз дарогу, — засмяяўся першы.

Хлопцы знайшлі аб'ект для прыкола і пачалі далей распытваць мяне.

— Праз дарогу. Дык ты, па ходу, не з самаво Магілёва, а? — запытаў лысы і працягнуў смяяцца.

— З самога. Нарадзіўся там, жыву сабе, — адказаў я.

— Гы-гы! Праз дарогу! Ды ня ўры ты. Мы жа слышым! — не ўнімаўся з паколатым па дыяганалі зубам хлопец.

— Дык я ж нармальна вам пабеларуску адказаў, — абурыўся я.

— Да не пераживай ты так, мы тожа не с самога Гродна, мы з-пад Гродна, — супакоіў мяне лысы. — А пашлі з намі, ты нам очэнь панравілся!

— Дзякуй, канешне, за запрашэнне, але я не адзін, — і позіркам паказаў на сваіх дзяўчат, якія размаўлялі між сабой, на нас не зважаючы.

Калі мы ехалі ў панарамным ліфце, калдыры не сунімаліся: гучна смяяліся і былі ўдзячныя Лукашэнку за тое, што ён «пастроіў такі дом» і што магазін «праз дарогу».

**Вітальд Няўрыда, Магілёў**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вярнуць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29

## АБВЕСТКІ

### Конкурс «Беларускі настаўнік года»

Таварыства беларускай школы (ТБШ) абвяшчае чарговы конкурс. У ім могуць узяць удзел педагогі усіх тыпаў установ (ад дашкольных да каледжаў), акрамя ВНУ, са стажам працы не менш за тры гады. На кандыдата конкурсу запаўняецца анкета (дадаецца) рэкамендуючай арганізацыяй, установай або самім педагогам і дасылаецца да 10.05.2010 на адзін з адрасоў: tbskoly@tut.by або іншыя, якія можна атрымаць па даведачным тэлефоне: (29) 752-08-21. Могуць дадавацца іншыя матэрыялы, што пацвярджаюць высокія вартасці кандыдата. Пры неабходнасці журы ТБШ можа наведаць установу конкурсанта. Конкурс будзе асвятляцца ў прэсе, і ў інтэрнэце на сайце nastaunik.info.

Крытэрыі вызначэння пераможцаў конкурсу: выкладанне па-беларуску; прафесіяналізм і наватарства, творчасць і навуковасць; аўтарытэт сярод калег, бацькоўскай грамадскасці і навучэнцаў; высокая грамадзянская пазіцыя.

### ЕГУ запрашае на праграму «Беларусістыка: Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія»

На праграме выкладаюць вядомыя гісторыкі-навукоўцы, сярод якіх — Захар Шыбека, Генадзь Сагановіч, Алесь Смалянчук. Прадугледжаны этнаграфічныя і краязнаўчыя экспедыцыі, археалагічныя раскопкі, магчымасць працы ў архівах і бібліятэках Вільні.

Паступленне ў ЕГУ адкрывае для беларускіх студэнтаў магчымасць разнастайных стажыровак і ўдзелу ў праграмах абмену з еўрапейскімі ўніверсітэтамі. Трое выпускнікоў праграмы мінулага года працягнулі навучанне ў Паўднёва-Заходнім каледжы Канзаса (ЗША), адзін у магістратуры Варшаўскага ўніверсітэта, двое ў магістратуры ЕГУ.

Поўную інфармацыю пра ЕГУ і праграму «Беларусістыка» можна знайсці на сайце ehu.lt.

# У Мінску з'явяцца білборды з партрэтам Караткевіча

Як гэта часта бывае, дзяржаўнае прызнанне да чалавека прыходзіць пасмяротна.

Міністэрства культуры паведаміла, якія мерапрыемствы рыхтуюцца да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча.

Найперш запланавана мемарыялізаваць і добраўпарадкаваць Караткевічаўскія мясціны. Працы шмат. У Рагачове захавалася хата дзядзькі пісьменніка, дзе былі напісаныя «Ладдзя роспачы», «Сівая легенда». Але на ёй няма ніякай памятнай табліцы. У хаце можна было б стварыць і асобны музей. Але гаспадар, стрыечны брат Караткевіча Сяргей, адмовіўся вызваліць хату і пераехаць у кватэру, якую прапаноўвала дзяржава.

Вуліцу Чкалава, дзе стаіць хата, назавуць імем Уладзіміра Караткевіча.

Сёлета ў Кіеве, дзе пісьменнік вучыўся на філфаку ўніверсітэта, паўстане яму помнік. Прадугледжанае і выданне твораў Караткевіча на замежных мовах.

На кінастудыі «Беларусьфільм» пачалі працу над стварэннем 4-серыйнага мастацкага фільма па кнізе «Каласы пад сярпом тваім». Гэтым займаецца выдатны рэжысёр Мікалай Пінігін.

Запланавана і правядзенне мастацкіх выстаў, канферэнцый.

А на вуліцах Мінска з'явяцца білборды з партрэтам пісьменніка.

Як гэта часта бывае ў Беларусі, дзяржаўнае прызнанне да чалавека прыходзіць пасмяротна.

**КМ**



КАСТУСЬ МАТУШЧЫЦ

**Бацькоўская хата Караткевіча ў Оршы.**



**Піратам Роберт Даўні яшчэ не быў.**

## Дзе рымэйк, Білі?

Новыя «Востраў скарбаў», «Франкенштэйн» і «Каласы пад сярпом тваім» здымуць у 2010 годзе.

### Востраў скарбаў

У 2010 годзе ў свеце і ў Беларусі будуць паднаўляць правераныя часам блокбастэры і экранізаваць класічныя творы.

Не толькі Франкенштэйн замысліў вярнуцца ў сучасным фармаце. Як піша кінематаграфічны часопіс Empire, «Востраў скарбаў» — класічная кніга Роберта Льюіса Стывенсана — можа з'явіцца ў кінатэатрах у аднаўленай версіі.

Ад 1920 г., калі выйшла першая нямая кінематаграфічная версія, нямала рэжысёраў перапрацоўвалі паспяховы раман. Брытанская студыя Ecosse Films здымае найноўшую версію, натхнёную шалёным поспехам іншай пірацкай гісторыі апошніх гадоў, «Піратамі Карыбскага мора».

Аднаногага Сільвера сыграе Шэрлак Холмс-2010, ён жа Роберт Даўні-малодшы.

### Франкенштэйн-2010

У 2004 годзе аўтар літаратурных трымценнікаў Дзін Кунц ажывіў трохі памярцвелы вобраз пачвары Франкенштэйна. У трох кнігах ён распісвае прыгоды пякельнай істоты ў Новым Арлеане нашых дзён. Часопіс Variety паведамляе, што прадусары Ральф Вінтэр і Тэры Бутвік рыхтуюць кінематаграфічную версію кнігі Кунца.

### Цяжкія ментальныя канструкцыі

Крыху кур'ёзнага. Цяпер дзіцячыя забавы «Манаполія», Lego і «Трансформеры» адстаюць ад свайго канкурэнта Meccano. Канструктар з жалезных дзіркаватых пласцінак, з дапамогай якога дзеці ўсяго свету робяць першыя крокі ў інжынерыі і будаўніцтве, набудзе кінематаграфічнае ўвасабленне. Амерыканская кампанія Helix Films мае намер зняць сямейны фільм паводле гэтага канструктара. Які сюжэт? Адказу пакуль няма. Стваральнікі адкрылі толькі, што гэта будзе моднае сёння 3D.

### Каласы пад сярпом тваім. The Movie

Перанесці раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» у тэлерадыёфармат спрабаваў шмат хто. Спярша ў канцы 1980-х на Беларускім радыё была зроблена шматгалосая радыёпастаноўка рамана. Кіраўніком галасавой трупы тады выступіў тэатральны рэжысёр Валеры Анісенка. У 2007-м ужо без музыкі і адным голасам «Каласы» агучыў выкладчык сцэнічнай мовы, прафесар Андрэй Каляда. Выйшла CD-кружэлка з поўным тэкстам рамана, які гучыць цягам 40 гадзінаў.

Анісенка доўгія гады выношваў ідэю паставіць раман на сцэне. У 2008-м на падмостках Тэатра беларускай драматургіі ён спраўдзіў сваю мару.

І вось 2010 год — аўтар шчымлівага прачытання «Тутэйшых» і «Сялянкі» Мікалай Пінігін будзе здымаць «Каласы пад сярпом тваім» на «Беларусьфільме». Сцэнар фільма піша Аляксандр Канановіч, аўтар эксцэнтрычнай камедыі (там на галаву галоўнаму герою валіцца каляровая карова) «Колер кахання». Такім чынам, «Тутэйшыя»+«Колер Кахання»=«Каласы пад сярпом тваім» узору 2010 года.

**Ліза Кавальчык**



## Вітаўта зробяць каралём пасмяротна? Не ўдасца

Гістарычную несправядлівасць няма як выправіць.

З просьбай аб пасмяротнай каранацыі Вітаўта Вялікага ў Сойм звярнуўся віцэ-мэр Каўнаса. Просьбу ён аргументаваў тым, што ў 2010 годзе спаўняецца 580 гадоў з моманту, калі імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунд І пацвердзіў, што Вітаўт з'яўляецца каралём Літвы.

У адказе Інстытута гісторыі Літвы гаворыцца, што вялікі князь Вітаўт не стаў каралём, бо не былі выкананыя неабходныя дзеля гэтага юрыдычныя працэдуры, і не быў праведзены царкоўны абрад, не было атрымана блаславанне Папы.

Гісторык Артурас Дубоніс заклікаў заставацца вернымі гістарычнай праўдзе і не падтрымліваць «палітычных маніпуляцый гісторыяй і гонарам».

«Штучна надзетая на галаву мёртвага карона не надасць гонару ні яму, ні цяперашняй Літве. Ці неператворыцца яна ў блазенскі каўпак у вачах сусветнай супольнасці?» — кажа гісторык.

Паводле падання, пасланую Вітаўту карону перахапілі палякі. Каранаванне князя рабіла б Вялікае Княства Літоўскае роўным Польшчы. А гэта пярэчыла планам каралеўскага Кракава, дзе кіраваў Вітаўтаў стрыечны брат Ягайла.

**СГ**

## Краіна для дзівакоў

У пракат выйшла «Расія−88» Паўла Бардзіна — неанацысцкая псеўдадакументалка з Пятром «Гаем Гаалам» Фёдаравым у галоўнай ролі.




Герой «Расіі-88» («88» азначае НН, Heil Hitler) Саша Штык — чалавек, якому ўсё ясна: хто дрэнны, хто добры, каму слава, каму масаракш, а таксама што рабіць і асабліва — хто вінаваты. Вінаватыя ворагі Расіі — тыя, якія «панаехалі». Калі ў сястры Штыка пачынаецца раман з «каўказцам», дакументальная драма ператвараецца ў шэкспіраўскую трагедыю.

Фільм выкарыстоўвае «суб'ектыўную камеру» — яна адна з галоўных дзейных асобаў, прычым гэта асоба «непрыемнай» нацыянальнасці. «Непаўнавартасны габрэй», апаратар Эдзік, які пакланяецца Штыку, кампленсуе праз сваю кроў і падтрымлівае ідэі скінхэдаў. Штык называе Эдзіка — то бок камеру — Абрамчыкам.

Бардзін мантажуе псеўдадакументальныя кадры з сапраўды дакументальнымі інтэрв'ю на вуліцы, падчас якіх звычайныя людзі кажуць, што так, Расія — для рускіх.

І фінал: фільм заканчваецца мартыралогам — спісам людзей, якіх забілі неанацысты ў Расіі ў 2008 годзе.

**СМ**

## Казько і Федарэнка — лаўрэаты літаратурных прэмій — 2010

«Гліняны Вялес» атрымаў празаік Віктар Казько за раман «Бунт незапатрабаванага праху», выдадзены ў серыі «Кнігарня «Нашай Нівы».

Напрыканцы зімы вызначыліся лаўрэаты адразу дзвюх штогадовых літаратурных прэмій.

Па словах ініцыятара ўручэння прэміі паэта Алеся Аркуша, «сёлета вырашальным пры вызначэнні лаўрэата сталі крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы аўтарытэтных беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў, перадусім Міхася Тычыны».

Прэтэндэнтамі таксама былі «Цэнтр Еўропы» Уладзіміра Някляева, «Нічые» Андрэя Федарэнкі і «Праўдзівая гісторыя Кацапа, Хахла і Бульбаша» Уладзіслава Ахроменкі і Максіма Клімковіча і «Акно для матылькоў» Міхася Скоблы.

А «Залатую літару» за 2009 год, якую ўручае пісьменнік і выдавец Адам Глобус, атрымае Андрэй Федарэнка за кнігу «Нічые».

Глобус праводзіў адмысловую апытанку на сваім інтэрнэт-дзённіку, якая і засведчыла перамогу Федарэнкі.

Сярод намінантаў таксама былі Сяргей Календа «Помнік атручаным людзям», Уласік Смаркач, Сірошка Пістончык «Йопыты», Артурас Шыланскас «Зборнік хайку».

**Зміцер Панкавец**

## СЦІСЛА

### «Ляпіс» у Мінску 9 мая

«Ляпіс Трубяцкі» дасць вялікі сольны канцэрт 9 мая ў мінскім Палацы спорту. Магчыма, на разагрэве ў рок-каралёў адыграе гурт The Toobes. Пакуль вядуцца перамовы. У сакавіку «Ляпіс Трубяцкі» праедзе з турам у падтрымку альбома «Культпрасвет» па абласных гарадах Беларусі. 12 сакавіка «Ляпісы» выступяць у Гомелі, 13 — у Віцебску, 14 — у Магілёве, 19 — у Брэсце, 20 — у Гродне. А 4 сакавіка гурт прыме ўдзел у «Рок-каранацыі» ў сталічным клубе «Рэактар».

### Латушка: Канцэрт Rammstein-а адбудзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам

Паводле слоў Латушкі, эксперты з Мінкульта езьдзілі ў Расію не плануюць. «Арганізатары прадставілі абавязацельства, што канцэрт адбудзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі», — падкрэсліў міністр. Выступленне Rammstein павінна прайсці 7 сакавіка ў комплексе «Мінск-Арэна».

### Вызначыўся прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні»

Група «Тры плюс два» створана адмыслова з удзельнікаў праекта АНТ «Новыя галасы Беларусі». У гурт увайшлі Юлія Шышко, Алена і Нінэль Карповіч, Арцём Міхаленка і Егіазар Фараш'ян. Заваяваць еўрапейскую аўдыторыю малады калектыў паспрабуе песняй «Far Away» Леаніда Шырына і Юрыя Вашчука.

**КМ, БелаПАН, БЕЛТА**

# Беларускі бальзам

**Марыя Роўда.**
Апавяданне.

Гэны чалавек адняў акно, што выходзіла ў дварышча. Рама трымалася на трох цвіках і ўжо сама выпадала раз-другі ўлетку. Люба нават дзівілася, як гэта яшчэ ніхто да іх не ўлез у хату. Асабліва парачка мясцовых алкаголікаў — заўсёды без грошай, засмяглых, прагных выпіць. Іх далікатнасць пераўзыходзіла ўсе межы: у Любы грошай не пазычалі, мыла з падворка не кралі (у той час, як на гэта скардзіліся ўсе суседзі). Адзінае, хоць калі прасіліся, каб Люба адвезла іх на сваёй машыне за бырлам у суседнюю вёску. Аўтамабіль яе, чырвоны «Форд Ка», яны празвалі божай кароўкай. Відаць, ім падавалася стылёвым пад'язджаць на гэткай адмысловай цацачнай машынцы да крамы, на зайздрасць усім іншым засмяглым хадакам.

А пачалося ўсё з таго, што суседзі-алкаголікі перанялі неяк Любу ў Святках ля дзяржаўнай крамы. (Сама Люба закуплялася ў прыватнай крамцы «Алеся».) Галя з Валерам літаральна перакрылі целамі вузкую дарогу, расставіўшы ў бакі рукі. Звярнуць можна было толькі ў плот настаўніка малявання, таму жанчына мусіла спыніцца і запусціць пошасць у аўтамабіль. Парачка расцвіла. Кланяліся, усміхаліся шчарбатымі ратамі. Валера пачаў разувацца, стоячы на пяску. Люба запратэставала, але Галя таксама скінула гумовыя боты — у раблёных шкарпэтках з асцём і саломай палезла ракам праз пярэднія дзверы на задняе сядзенне. Селі, паехалі. Галя з Валерам радаваліся, як мурзатыя вясковыя дзеці. Распавядалі пра дачку (Любіну сяброўку дзяцінства), пра сваіх шасцярых унукаў, пра маленькага сына, аддадзенага на выхаванне талкаўнейшай за бацькоў дачцэ. Звычайнае кіно: алкашы вядуцца ў любым веку, як трусы, а нармальныя людзі вылічваюць дні авуляцыі, п'юць вітаміны, вядуць стэрыльны лад жыцця і ніяк не народзяць.

Тая іх паездка выклікала ўсеагульнае спачуванне да Любы з боку суседзяў і сяброў. Кожны другі дзелавіта пытаўся: «У машыне не смярдзіць?» «Не, — адказвала пацярпелая. — Муж прапыласосіў і памыў. Здымаў нават сядзенні. Знайшоў нямецкую яшчэ чайную лыжку і пяцьдзесят еўрацэнтаў». Рэагавалі амаль аднолькава: «Лепей пашукаў бы, дык і каску б нямецкую знайшоў». Але мыццё гэнае было часткова дарэмным. Галя з Валерам ператварылі добрасуседскія адносіны ў тэрор: часта яе не турзалі, але раз на тыдзень настойвалі на сумеснай вылазцы ў краму. «Хоць бы грошай не прасілі, — падбадзёрвала сябе Люба, — а то мы самі жабраваць пойдзем».

Хутка пачаліся пазачарговыя просьбы. Неяк раніцай Люба мыла ў сенях галаву. Ведаючы, што ў вёсцы амаль нікога няма, бо ўсе бабкі сядзяць у лісічках, сені яна не зачыніла. Калі ў дзвярах з'явілася Галя, дзяўчына ажно здрыганулася. Было ад чаго: мала таго, што яна спужалася, дык яшчэ і здзівілася. Да вяселля іх трэцяга сына заставаўся яшчэ тыдзень, але Галя была акуратна прычасаная, умытая, апранутая ў чыстую светлую крымпленавую сукенку. На ёй былі блакітныя баваўняныя шкарпэткі і белыя басаножкі. Без каросты на твары суседка выглядала як тыповая сібірачка з Алтайскага краю. Люба стаяла, разявіўшы рот, і вада з мокрых валасоў цякла на плечы і станік.

Галя сціпла прысела ў дварышчы на лаве. У руках яна сціскала рудую сумку — яшчэ гадоў дзесяць таму з такімі сумкамі бабкі ездзілі ў райцэнтр па хлеб і цукар.

— Мыешся?

— Мыюся.

— І я сёння галаву мыла.

— М-м.

— Давай з'ездзім у Святкі.

— Я ж мыюся.

— Ты ж ужо шампунь змыла.

— А я яшчэ бальзамам намажуся.

— Ну, дык і яго некалі змыеш.

— Чакаць трэба.

— Я пачакаю.

— Мне яшчэ сохнуць.

— У цябе ж у машыне печка.

— Усё роўна. Я мокрая не паеду.

— А я пазней падыду.

— Бензіну мала.

— ...

— *Грошай* няма. Грошы ў мяне адкуль? Я ж грыбы і ягады не здаю.

Галя, здаецца, пераканалася, што надзея на транспарт не спраўдзіцца. Неяк бокам устала з лавы, як быццам абмякла, аплыла ўся ўнутры сваёй параднай сукенкі, у задуменні папаўзла з дварышча. Праз паўгадзіны яна ўжо дзяўблася ў бок Святак у сваім звычайным вобразе: спартыўныя штаны, расцягнуты сіні гольф, брудная цёплая хустка на галаве, на нагах гумовыя боты. Люба думала, што памрэ ад сораму: чалавек, можа, новае жыццё збіраўся пачаць, а тут такі нядобрасуседскі аблом. «Няўжо я зброя цемры на гэтым свеце?» — жахалася Люба і папівала з васьмідзесяцігадовай сваячкай Рэняй свежавыціснуты парэчкавы сок.

Праз колькі хвілінаў хату мінуў змрочны Валера. «Во, адзеўся, як настаўнік! У чорным пінжаку, у крэмавых нагавіцах! Сэканд-хэнд ім на дзяцей прысылаюць! Далібог, як польскі кавалер! Хоць ты кніксэн перад ім рабі. Я ў польскую школу хадзіла, шэсць класаў скончыла. Мяне настаўнікі любілі, далей вучыцца клікалі, але я часта хварэла. Ды ў нас зямлі было! Трэба ж некаму рабіць. Дзеўка павінна была ткаць і прасці, а не кніжкі чытаць. Я папольску вершы ўмею. А за саветамі я непісьменнай лічылася», — затараторыла баба Рэня. «Валера ж Галю з Сібіры прывёз, — без пераходу працягвала сваячка. — Ён раней у Мінску жыў, жонку меў, кватэру і дзіцё. Казаў, на дошкі нейкія на танцы хадзіў. Вось праз дошкі гэныя і разышоўся. За аліменты яго ў калонію ўпяклі. А там ён з Галяй распісаўся і з двума дзецьмі яе сюды прывёз. Наташа з Мішкам не ягоныя, у іх сваіх толькі двое. Во як жыццё, бывае, павернецца. І я школу не скончыла. А настаўнік да мяне прыходзіў, угаворваў. Пераконваў бацьку: «Чловекем бэндзе!» Была б зараз настаўніцай, як ты». «Настаўніца ўжо даўно за чалавека не лічыцца», — хацела супакоіць бабку Люба, але вырашыла не разбураць чароўнай мары старой.

Увечары яны з мужам пілі гарбату і гаманілі пра здабыткі дня. Муж Віктар быў гісторыкам, працаваў на кафедры ва ўніверсітэце. Пасля абароны дысертацыі змог нарэшце спакойна заняцца любімай справай: ездзіў па навакольных вёсках, паданні запісваў, корпаўся ў курганах ля Княжына. У яго ўжо склалася свая паралельная гісторыя гэтага краю, і Люба ўважліва слухала пра неверагодныя выкрунтасы людзей і часу. Жонка любіла такія расповеды, ахвотна ездзіла з Віктарам на ровары да старэнькіх апавядальнікаў з напаўжывых падслепаватых вёсак, але курганы рушыць баялася. Нягледзячы на свой халодны навуковы розум, яна верыла ў містычных ахоўнікаў гістарычных месцаў. Пераказвалі, што яе прадзед бачыў ноччу ля Княжына дзяўчыну ў белым, а ў Матусевічах пераймаў людзей прывідны чорны чалавек у капелюшы. Не, лепей ужо жывыя суседзі-алкашы, чым гэныя здані.

Нечакана з вуліцы Любу паклікала жанчына. Праз фіранкі і прыцемак не відаць было, хто гэна, толькі вылучаўся сілуэт у яскравым чырвоным швэдары. «Бабы Рэні дачка,» — здагадалася Люба і, не марудзячы, адчыніла акно. Жах! Гэна зноў была Галя. Вясёлая, прыязная. «Не пакрыўдзілася», — суцешылася Люба. «Грошай папрасіць, — прашаптаў Віктар. — Прыгрэла алкалоідаў!»

— Любка! Я пытацца прыйшла. Як па-беларуску «жаворонок» будзе? Я ж сама з Расіі. Песня ёсць такая: «Жаваранак звініць і плача». А Валерка кажа «жаўрук».

— Жаўрук. Так і ёсць — «жаўрук». Але песню я не ведаю. Я рок слухаю.

— А-а. А мы сядзім, вершы адзін аднаму расказваем, пяём. Ну, я пайду. Во Валерка! Во разумны! Ледзь не такі прахвесар, як ты.

— Я не прафесар, я дацэнт. І тое — не па званні, а па пасадзе. Гэта благая прыкмета — званне накідаць. Сурочыш.

— Ой, складанае ў цябе жыццё, Любка. Жаўрук. Ха-ха. Ну, я пайду.

«Бачыш, — паддражніла мужа Люба. — Вершы расказваюць, пяюць. А мы развялі тут з табой гістарычную трупярню».

На наступны дзень Галя з Валерам зніклі з вёскі. На вуліцы не з'яўляліся, за бырлам ехаць не прасіліся. Нехта меркаваў, што яны выправіліся да сына, дапамагаць рыхтавацца да вяселля. Іншыя, як баба Рэня, лічылі, што алкашы проста не вытрымалі і закупілі выпіўкі на сабраныя з ягад грошы для сына. Вокны ў іхняй хаце былі завешаныя, а праверыць, засунутыя дзверы на засаўку знутры ці замкнёныя на замок знадворку, нават шпіёнкі-бабкі не парупіліся. «Хоць бы яны там жывыя былі», — нервавалася Люба, але ў астатнім бестурботна дажыла апошні тыдзень вакацый, у той час як Галя з Валерам нема і зацята прапівалі на падлозе ў хаце вясельны падарунак сыну.

Калі адпачынак скончыўся, Люба з Віктарам выправіліся ў горад. Спадзеву на хуткае вяртанне не было, бо працавалі сем дзён на тыдзень. Пасля параў у суботу не мела сэнсу некуды далёка кідацца, і Віктар лічыў за шчасце пасядзець у архівах, а Люба нават у нядзелю сустракалася са сваімі аспірантамі і магістрантамі. Да таго ж увосень у горадзе віруе свецкае жыццё. Усе свежанькія і творчыя пасля адпачынку — так і струменіць крэатыў, толькі паспявай перабягаць ад музея да тэатра.

Але неспадзеўна верасень пайшоў па іншым сцэнары. Упершыню за пятнаццаць гадоў працы расклад у абаіх зрабілі такі, што ў суботу не было параў. І хоць начальства ўважліва сачыла за выкананнем кантракта і папярэджвала, што шэсць дзён на тыдзень раб-выкладчык павінен знаходзіцца ў пятнаццаці хвілінах язды ад універсітэта, Люба з Валерам вырашылі рызыкнуць — ездзіць па выхадных на лецішча ў вёску. «Зараз людзі яшчэ ні бульбы не бяруць, ні гародаў не парадкуюць. Ягады адышлі, восеньскія грыбы не прымаюць. Я шмат чаго змагу запісаць. Зацішна, сентыментальны вераснёўскі настрой — у старых языкі развязуюцца», — марыў Віктар. «Мая прафесарка з Масквы палову былога Саюза на лецішчы кансультуе, а потым два дні на тыдзень такія лекцыі чытае, якія ў нас дакладна не пачуеш. І ніхто не загадвае ёй бязвылазна сядзець на кафедры», — бухцела Люба. «Прарвемся. Ад нашай кватэры на ўскрайку столькі ж ехаць да ўнівера, колькі адсюль з перавышэннем хуткасці на якіх-небудзь дзесяць кіламетраў», — падбухторваў яе Віктар. «А калі пазногці будуць брудныя, адзежа прасмердне печкай?» — вагалася Люба. «Слухай, твая загадчыца не Шэрлак Холмс. Да таго ж ты сама казала, што яна сама ніколі пазногці не фарбуе. Можа, яна цябе нарэшце палюбіць?» — пасмяяўся муж.

Вырашана было ў пятніцу пасля заняткаў заскокваць у машыну і мчаць за горад. Аспіранты-магістранты мусілі адрывацца ад падпрацовак і абурана выпраўляцца на кансультацыі да Любы сярод тыдня, а архіў — чакаць зімы і змены раскладу. А трэцяй гадзіне дня Люба ўжо зарульвала на святкаўскае скрыжаванне ля дзяржаўнай крамы. Яна ўспомніла пра Галю з Валерам і тую летнюю засаду, а заадно і пра тое, што ў хаце няма запалак.

Люба спынілася ля распіснога плота настаўніка малявання і пабегла ў краму. Тая, дзякуючы суседзям, асацыявалася ў яе выключна з бырлам. Мясцовыя п'яніцы, што яшчэ не зусім адпілі мазгі, нават мелі ў краме крэдыт і вярталі грошы з палучкі альбо са здадзеных чарніц і лісічак. Таму, купляючы запалкі, Люба міжволі кінула позірк на паліцу з алкагольнымі напоямі і здзівілася, убачыўшы на ёй «Беларускі бальзам». П'яніцы такога не пацягнуць па грашах альбо проста пагрэбуюць, бо п'юць, па іх меркаванні, нармальнае віно. Здаецца, «Беларускі бальзам» быў выстаўлены на продаж спецыяльна для такіх вытанчаных вераснёўскіх пакупнікоў, як Люба. Для такіх, што зварацъ сабе добрай кавы, дададуць туды кроплю бальзаму, сядуць ля печкі і будуць чытаць навуковы часопіс або разумную кніжку ці балбатаць па мабіле з якім-небудзь мінскім інтэлектуалам альбо калегай з Берліна. Зачараваная ўласнай выкшталцонасцю рабавыкладчыца, што ўцякла на выходныя, узяла бутэльку бальзаму і дома з гонарам паставіла яе ля кафейнага сервіза з кельцкім арнаментам. Але кавы яна не папіла ні ў гэны, ні на наступны дзень.

Спачатку бліжэй да вечара скончыўся газ — да Радаўніцы яны не збіраліся вяртацца ў вёску і не замовілі новы балон. Проста заліваць каву кіпенем з электрачайніка Люба палічыла плебействам і падрыхтавалася трываць цяжкасці, пакуль не прывязуць электраплітку бацькі. Тыя, па шчаслівым супадзенні, вырашылі якраз прыехаць у грыбы.

Назаўтра раніцай перагарэлі пробкі, і Люба з Віктарам, паснедаўшы сухапярам бутэрбродамі, выправіліся ў азызлы лес, малюючы ва ўяўленні сваё бясслаўнае вяртанне ў межы «пятнаццаці хвілінаў язды». Поўныя кошыкі тугіх баравікоў неяк суцешылі іх, але халодная драбніца прабівала на кашаль. Люба баялася захварэць і пачала прыкідваць, як бы папіць гарачага. Пайсці да бабы Рэні папрасіць гарбаты? Але ў вёсцы свае законы — падумаюць, што яна напрошваецца паесці або ўвогуле звар'яцела: хадзіць да паўдня ў госці, прасіць гарачага папіць. Зазірнуць да Галі з Валерам? Але ці вядзецца ў іх што ў гаспадарцы, акрамя бырла, ды ці ў вёсцы яны — можа, ужо балююць дзе ў Святках? Люба пачала ціха падвываць і скардзіцца Віктару на нягоды. «А ты выпі бальзаму, — прапанаваў ён. — Там зёлкі ёсць — гэта лячэбная рэч. І моцная. Дапаможа». Люба пасмактала грамаў дваццаць таго напою. І праўда, зрабілася цяплей, і горла ўжо не балела. Прыехалі бацькі з сябрамі, прывезлі замоўленыя пробкі і электраплітку. Пачалося бясконцае перабіранне грыбоў, варка супу, і за агульным тлумам да кавы ля печы справа ў гэны дзень ізноў не дайшла. Пастаўленая на старую абшытую дрэвам лядоўню «Снайге», бутэлька з бальзамам была забытая на паўгода. Толькі хоць калі зімой Люба ўзгадвала пра яе ў горадзе. Добра было б, замест таго каб на парах сядзець, пакатацца на лыжах у вёсцы: тая нявыпітая кава з бальзамам альбо гарбата з духмянага малінніку...

І вось сталася так, што гэны чалавек адняў раму ад дварышча, адчыніў фортачку, дастаў цвік і



**Марыя Роўда**

друкуецца з 1993. Выкладчыца МДЛУ. Каранямі з Мядзельшчыны.

выняў унутранае акно. Перакінуў тулава на падваконне, удыхнуў пах чыстай бялізны з шафы, ляжалых посцілак і пагрызеных мышамі шпалераў. Раней у малым пакойчыку стаяў ля акна жалезны ложак. У дзяцінстве Любе падабалася ляжаць на ім, трымацца рукой за металічную шышку на брыжы, слухаць лета. Як куры квокчуць, пчолы гудуць, дзеці смяюцца, калодзеж рыпіць. Гадоў у дзесяць, лежачы на тым ложку, Люба чамусьці наважылася сама сабе адказаць на пытанне, ці ёсць Бог. Невядома чаму, ёй так закарцела разабрацца з гэтым, але кожны дзень яна сядала з пазакласным чытаннем на ложак, прыслухоўвалася да наваколля, да сваіх думак, сагравала рукой металічны набалдашнік і пыталася ў сябе: «Ці ёсць Бог?» Тады яна вырашыла, што Бог ёсць. Беспадстаўна, бяздоказна — проста прыняла ў сябе гэты пастулат і ніколі ў ім болей не сумнявалася.

Цяпер ложак пераставілі да сценкі і на яго месцы стаяў нізкі фатэль. Ніхто ніколі не сядзеў у ім, бо пачытаць кніжку ўсё роўна любілі на тым самым ложку, як на ўтульнай норцы — ложак быў часткова застаўлены шафай. На фатэлі складалі коўдры і посцілкі, і чалавек гэны мякка спусціў на іх ногі ў запэцканых граззю гумовых ботах.

Ён толькі што быў у Галі з Валерам, мірна выпіваў, абыякава аглядаў іх голую хату, ведаючы, што там няма чым парадаваць сваю клептаманію. Жыў Юрка ў суседняй вёсцы на звалцы, бо бацька прагнаў яго з хаты за штогадовыя судзімасці, п'янства і зладзеяватасць. А што ў вёсцы красці, чым наталяць сваю асацыяльную прагу? Вось хата адна нядаўна гарэла — толькі і радасці, што нацягаў сабе потым у логава абгарэлага рыззя. Вяртацца туды проці ночы не хацелася, мучыў голад, карцела яшчэ выпіць. Галі з Валерам ужо нямнога было трэба — пастарэлі. А яму яшчэ дваццаць пяць — малады арганізм просіць добра выпіць і закусіць.

Юрка паспрабаваў раскруціць сяброў на працяг балявання. Гаспадары аднекваліся, хілілiся да брудных падушак. Госць разважаў уголас, да каго б яшчэ прыбіцца, дзе б пажывіцца. Валера, ледзьве вяжучы лыка, узгадаў Любу: «Вось каб нам божую кароўку сюды ды ў Святкі пракаціцца — з музыкай, уключыўшы печку». Юрка зацікавіўся, што за божая кароўка такая. Разамлелыя, Галя з Валерам яшчэ болей расплыліся, перанесліся ў думках у летняе цяпло. Вяла, з усмешачкай Валера распавёў Юрку пра суседку. Той не веры ўшам: зусім побач, за трыццаць метраў стаяла хата, поўная райскіх дабротаў, а ён нудзіўся тут, у галяку. Разамлелыя сябры-сабутэльнікі ўжо не цікавілі і не раздражнялі яго. Ён адчуваў у сабе хваравіты гон, які беспамылкова дапамагаў яму знайсці гадзіннік у раздзявалцы, пакуль аднакласнікі былі на фізкультуры, адшукаць слоік агуркоў у суседкі ў сенях ці бутэльку гарэлкі, прыхаваную аднавяскоўцам да пасадкі бульбы. Юрку няважна было, што гадзіннік у яго адбяруць на наступным уроку, што за слоік ён атрымліваў таўкачом па карку, а за гарэлку — і ў вуха кулаком, бо ніколі не ўмеў хаваць крадзенага ці талкова скарыстацца са свайго нешчаслівага таленту.

І вось ён выйшаў з маленькага пакойчыка ў гэну хату. Тут было чыста, на падлозе ляжаў новы зялёны дыван, раскладзеная канапа была засланая посцілкай, шытай з сотаў-кавалачкаў штучнага футра (след маніі, якая ахапіла іх вёскі гадоў дваццаць таму). На журнальным століку быў абыяк нагрувашчаны стосік кніжак. На сценах, у серванце меліся фатаграфіі розных гадоў і, па вялікім рахунку, цяжка было зразумець, хто жыве ў гэтым доме: ці якаянебудзь бабка, ці дачнікі. Юрка адчыніў белыя дзверы і ўвайшоў у гэту хату. Смярдзела халоднай печкай, па падлозе і працёртым дыване ішлі белыя пісягі — відаць, мышы цягалі аднекуль муку. Ён прайшоўся па мышыных слядах — так і ёсць. На маленькай рудой лядоўні стаяў прагрызены пачак мукі, трохлітровы слоік заканага салёнага сала і амаль поўная бутэлька «Беларускага бальзаму». Жыццё расквецілася фарбамі. Тут — Юрка ведаў — ніхто не мог схапіць яго за руку, вырваць з рота кавалак сала, запатрабаваць падзяліцца літвом. Усё гэта было нічыйным. Нічыйным, бо і хата была не хата, а нейкае лецішча. І жыццё людзей тут было не сапраўдным, а ляленчым — далёкім ад усіх вясковых клопатаў, кшталту сена, дроваў, бульбы, пасты, свіней і бясконцага летняга збірання грыбоў-ягадаў. Таму можна было не адчуваць згрызотаў сумлення, а ўявіць сябе сытым дачнікам, чужынцам у вясковым свеце, і з асалодай выпіць ды закусіць.

Юрка сеў да стала. Дастаў з шуфляды адкрывалку, пагартаў знойдзены там жа блакноцік з рысачкамі-працаднямі і запісамі кшталту «11-га кідалі гной у Вовсаве». Абыякава засунуў шуфляду, апусціў цыратку. Наліў бальзаму ў кубак з нейкімі калючкамі ва ўзоры. Каўтнуў напою. Пасмактаў ягоную горыч, вязкасць. Адкрыў слоік, уцягнуў носам пах часнаку, адгрыз кавалак сала. Бальзам выпіў увесь. Зняў з тумбачкі вышываную сурвэтку, абгарнуў ёй слоік, засунуў пад паху. Перайшоў у гэну хату, лёг у ботах на канапу, павалозіў шчакой па штучным футры і заснуў.

Прачнуўся рана — якраз каб сысці незаўважаным. Прыхапіў з сабой футраную посцілку і слоік з салам. Ціхенька зачыніў акно. Другую раму акуратна паклаў на дах маленькай пісклятні, прыбудаванай да істопкі. Юрка быў задаволены сваім дачным досведам. Валерава «божая кароўка» не расчаравала. Ён ведаў, што няхутка сюды вернецца, бо шчасце лепей не шукаць на старым месцы. Гародамі Юрка пашыбаваў далёка ў поле, каб выйсці на дарогу ля моста і каб ніхто не змог западозрыць, дзе прабавіў ён гэтую ноч, і не збунтаваў яго па-зладзейску прыдбаную асалоду.

Юрка не ведаў, што ў яго ёсць яшчэ тыдзень часу. Сем дзён да Радаўніцы, пакуль не прыедуць гаспадары хаты. Пакуль не здзівяцца пустой бутэльцы на стале, не схопяцца посцілкі, не заўважаць адсутнасці другой рамы, не заявяць у міліцыю. Пакуль Люба не расплачацца, што згвалцілі яе родны дом, у якім яшчэ ніколі за жыццё ўсіх пакаленняў не адбылося ніводнага злачынства. Пакуль міліцыя, стомленая тупасцю Юркі, не знойдзе ў яго бярлозе на звалцы скрадзеныя ў гэтых вучоных шызікаў рэчдокі.

А Юрка будзе жыць цэлы тыдзень бесклапотным дачнікам і звысоку паглядаць у Святках на Галю з Валерам, калі тыя, абняўшыся, прыйдуць купляць *нармальнае віно.*

*Травень 2009 г.*

# Польскі вопыт: селянін скупіў сабе 900 гектараў зямлі. І хоча яшчэ

Праца на зямлі можа даваць прыбытак, але каб развіць яе да стану вялікага бізнэсу, вы павінны мець як мінімум сто гектараў. І якой бы вялікай ні была вытворчасць, не варта спадзявацца толькі на адзін яе від. Трэба займацца чымсьці яшчэ. Размова з польскім фермерам з-пад Любліна Лешкам Дыдынам.



Лешак Дыдына з сынамі.

**— Вы пачалі з некалькіх гектараў зямлі, цяпер маеце іх сотні. Як малазямельны селянін можа стаць землеўласнікам?**

— Па-першае, трэба захацець. Я хацеў. Я заўсёды марыў пра вялікую гаспадарку. У маіх бацькоў было пяць гектараў зямлі. Калі я вярнуўся з войска ў 1973 годзе, яны мне дапамаглі купіць 8 гектараў. З гэтага і пачаў.

**— І колькі ў вас зямлі цяпер?**

— Сам я маю 454 га, у старэйшага сына 319 га, у малодшага – 114. Усяго маем амаль 900 га і 32 га здаем у арэнду. Мы хочам дакупіць яшчэ 140 га фермы да гаспадаркі малодшага сына.

**— Вы кіруеце гаспадаркай супольна?**

— Так, гэта мой сакрэт поспеху. Тое самае рабілі мы з бацькам — у нас было дзве фермы, але мы ўсё рабілі разам. І я раблю тое самае са сваімі дзецьмі. У нас няма «майго» і «твайго» — гэта ўсё «наша».

**— Можна добра жыць і з сельскай гаспадаркі?**

— Так, але нават калі маеш вялікі лан зямлі, яна не можа быць заснаваная толькі на адным відзе прадукцыі. Бо калі не сушыць, то мочыць, і можна страціць усё. Павінен быць нейкі запасны варыянт, які дапаможа перажыць неўраджайныя гады. Я, напрыклад, як толькі купіў ферму разам з сельскагаспадарчай тэхнікай, адразу пачаў з яе дапамогай аказваць паслугі суседзям.

**— А што адбылося пасля 1989 года [год падзення рэжыму ў Польшчы — Рэд.]?**

— Перш за ўсё, пачалі знішчаць саўгасы. Мабыць, палітычнае рашэнне аб ліквідацыі саўгасаў было прынятае яшчэ ў 1990 годзе, але іх сапраўдны занепад пачаўся вясной 1993 года, тады паўсталі першыя філіялы Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці і пачалося татальнае раскраданне ўласнасці. Былда прадавалі, а грошы ішлі на аплату працы.

**— Што банкруцтва саўгасаў значыла для вас?**

— Ужо ў 1993 годзе я арандаваў першыя 57 гектараў былой саўгасаўскай зямлі. Потым арандаваў яшчэ, паступова выкупляючы. Гэта быў шанец для мяне і тых фермераў, якія, як і я, бачылі сваю будучыню ў гаспадаранні.

**— Добра, што Польшча ў Еўрасаюзе? Ён дае дапамогу, і яна большая, чым ад камуніста Герка?**

— Напачатку я думаў, што добра. За першы год жывёлагадоўля добра зарабіла – цэны пайшлі ўверх. Але ў мяне былда не было, толькі збожжа і свінні; а збожжа патаннела. Таму ў першы год, нягледзячы на выплаты сельскагаспадарчых субсідый, прыбытак быў на 180 тысяч злотых меншы, чым за мінулы. Але потым усё паступова прыйшло ў норму, і сёння я магу сказаць, што ў нас з'явілася відавочная перавага. Гэта не столькі выплаты, колькі адкрыццё замежных рынкаў. Мы ўжо тры гады амаль увесь рапс прадаём у Германію, там плацяць больш.

**КаМ; паводле gazeta.pl**

КАХАННЕ

# Разумнейшыя не здраджваюць

**Мужчыны з самым высокім IQ больш манагамныя і, адпаведна, менш схільныя да здрадаў.**

Высвятляецца, што разумныя мужчыны рэдка здраджваюць жонкам. Навукоўцы з Лонданскай школы эканомікі і палітычных навук высветлілі, што мужчыны з самым высокім IQ больш манагамныя і, адпаведна, менш схільныя да здрадаў.

То бок разумнейшыя, насамрэч, думаюць часцей пра іншае. Паводле словаў даследчыкаў, такія мужчыны надаюць больш значэння сэксуальнай выключнасці партнёркі. Прычыны таго, што разумныя мужчыны захоўваюць вернасць сваім спадарожніцам, хаваюцца ў эвалюцыйным развіцці.

Пры гэтым, як адзначаюць навукоўцы, сувязі паміж узроўнем інтэлекту у жанчын і вернасцю выявіць не ўдалося. На жаль.

Паводле статыстыкі, у Еўропе да 40% пар не лічаць здраду нагодай для разрыву. Пры тым мужчыны даруюць здраду шмат радзей, чым жанчыны.

**СХ, паводле Daily Telegraph**



Сувязі паміж узроўнем інтэлекту у жанчын і вернасцю выявіць не ўдалося.

АЎТА

# Штогадовы аўтарэйтынг Consumer Reports: Японцы зноў найлепшыя



**Амерыканскае выданне Consumer Reports апублікавала штогадовы спажывецкі рэйтынг аўтамабіляў. У шасці з дзесяці намінацый панавалі аўтамабілі японскіх марак, а найлепшым быў прызнаны Lexus LS 460.**

Consumer Reports — гэта часопіс незалежнага саюза спажыўцоў, які фінансуецца з ахвяраванняў грамадзянаў.

Эксперты Consumer Reports штогод выпрабоўваюць 300 аўтамабіляў, кожны з якіх праходзіць да 50 розных тэстаў. Таксама пры складанні рэйтынгу ўлічваюцца вынікі краш-тэстаў, праведзеных незалежнымі дзяржаўнымі і страхавымі арганізацыямі і вынікі апытання больш за 5 млн чалавек.

Нягледзячы на скандал вакол Toyota, прадукцыя японскага канцэрна заслужыла высокія ацэнкі экспертаў. «Найлепшым па ўсіх параметрах» у 2010 годзе прызнаны Lexus LS 460, а сярод экалагічных аўтамабіляў перамогу атрымаў гібрыд Toyota Prius трэцяга пакалення.

«Паводле дадзеных нашага апытання, Toyota дагэтуль робіць самыя надзейныя транспартныя сродкі. На другім месцы Honda», — прыводзіць часопіс словы дырэктара тэставага цэнтра.

**КаМ**




## ФУТБОЛ

**БАТЭ — «Нафтан»**

**8 сакавіка ў мінскім футбольным крытым манежы (Вяснянка)** упершыню пройдзе матч за Суперкубак Беларусі. Сустрэнуцца чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ і ўладальнік Кубка Беларусі наваполацкі «Нафтан». **Пачатак у 15.00.** Цана білетаў — 10 тысяч рублёў.

## КАНЦЭРТЫ

**Вайцюшкевіч — 6 сакавіка**

**6 сакавіка ў Малой зале КЗ «Мінск»** аўтар-выканаўца Зміцер Вайцюшкевіч прадставіць святочную праграму «Арыстакратка Кахання» на вершы Генадзя Бураўкіна, Уладзіміра Някляева, Рыгора Барадуліна. **Пачатак канцэрта а 19-й.** Кошт квіткоў: 20 000 руб. — 40 000 руб.

**«Ляпіс» у Гомелі**

**12 сакавіка ў Гомельскім цэнтры культуры** — канцэрт «Ляпіса Трубяцкога». Гурт прадставіць альбом «Культпрасвет». **Пачатак а 19-й.**

**Метал-фэст у «Рэактары»**

**12 сакавіка ў мінскім клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** метал-фэст Metalfront.org Music Awards 2009. **Пачатак а 17-й.**

**Port Mone**

**13 сакавіка на сцэне Тэатра беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44)** пройдзе прэзэнтацыя беларускага выдання дэбютнага альбома гурта Port Mone «DiP». **Пачатак а 19-й.**

**Фестываль фальклору**

**13 сакавіка ў кавярні «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская, 12)** адбудзецца невялікі фестываль беларускага і замежнага фальклору. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Латышонак і Булгакаў у Гродне**

Прэзэнтацыя новай кнігі Алега Латышонка «Беласток—Полацк» і манаграфіі «Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII да пачатку XXI стагоддзя» з удзелам аўтара і рэдактара ARCHE Валера Булгакава адбудзецца ў **Гродне 4 сакавіка. Мерапрыемства пачнецца ў 18.30 па адрасе: вул.Будзённага, 48А, пакой 100.** Уваход вольны.

**Беларускія танцы ў Мінску — шточацвер**

**Штачацвер ад 19-й да 23-й у кавярні «Жар-птушка»** адбываюцца беларускія вечарынкі. Уваход каштуе 6 тыс. рублёў з носа. Зазвычай збіраецца каля 70—80 чалавек. Наведваюць танцы пераважна юнакі і дзяўчаты: студэнты і працоўныя. Але прыходзяць часамі, у ранейшыя гадзіны, і сем'і з дзецьмі-школьнікамі, якія паміж танцамі тусуюцца ля гульнявых аўтаматаў. Для дзяцей уваход нічога не каштуе. На танцах вучаць ойру, падэспан, полькі. Большасць наведнікаў — беларускамоўныя. Кавярня месціцца ў парку Горкага, ля вадаспаду. Даезд да метро «Плошча Перамогі» ці аўтобусам нумар 100 па праспекце. Або трамваямі да прыпынку «Парк Горкага».

**Джэм з удзелам Арлова і Глобуса**

**3 сакавіка**, у Міжнародны дзень пісьменніка, творчая прастора Bybooks, кнігарняЎгалерэі і Беларускі ПЭН-цэнтр прадстаўляюць Jam by books. Кожнаму з запрошаных на джэм аўтараў будзе дадзена 15 хвілін, каб прачытаць свой самы новы твор. Сярод удзельнікаў — Уладзімір Арлоў, Адам Глобус, Павал Касцюкевіч, Віталь Рыжкоў, Наста Манцэвіч, Андрэй Адамовіч, Марыйка Мартысевіч. **Пачатак у 19.00. Адбудзецца імпрэза па адрасе: пр.Незалежнасці, 37а.**

**Сустрэчы з пісьменнікамі**

**10 сакавіка** Эдуард Акулін і Леанід Дранько-Майсюк ладзяць сустрэчу з чытачамі **ў Абласной бібліятэцы імя Пушкіна (вул.Гікала, 4). 11 сакавіка** пісьменнікі правядуць творчую сустрэчу са студэнтамі **Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва (вул. Ціміразева, 65А). Пачатак аб 11-й.** Уваход вольны.



**Безпрабелаў**

**10 сакавіка а 19-й гадзіне** імпрэза Безпрабелаў: паралельныя тэмы ў тэкстах Вольскага і Анемпадыстава. Розніца аўтарскіх трактовак адных і тых жа падзеяў, вобразаў, паняткаў. Старыя і новыя творы. Нязмушаная размова, адказы на пытанні, інтэлігентныя жарты. Адсутнасць нецэнзурнай лексікі з вуснаў выступоўцаў гарантуецца. **Адбудзецца імпрэза па адрасе: пр.Незалежнасці, 37а.**

**Замак з крапівы**

**16 сакавіка ў Музеі беларускай літаратуры (вул. М. Багдановіча, 13)** — прэзэнтацыя рамана Зьмітра Вішнёва «Замак, пабудаваны з крапівы». Бяруць удзел: Адам Глобус, Альгерд Бахарэвіч, Барыс Пятровіч, Андрэй Бём, Пятро Васючэнка, Вольга Гапеева. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Балтыйскі шлях, які змяніў свет**

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 14 сакавіка** працуе фотавыстава «Балтыйскі шлях, які змяніў свет. Падзеі 23 жніўня 1989 г.», прысвечаная 20-й гадавіне найбуйнейшай сімвалічнай акцыі народаў Літвы, Латвіі і Эстоніі за незалежнасць. Тысячы людзей, пабраўшыся за рукі, утварылі жывы ланцуг, які злучыў тры балтыйскія дзяржавы ў іх імкненні да свабоды.

**Старыя і новыя Ваўкавыск**

Адкрыццё фотавыставы «Старыя і новыя Ваўкавыск» адбудзецца **ў Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах Мінскага раёна 6 сакавіка ў 14.30.** Аўтар — кіраўнік Ваўкавыскай арганізацыі Таварыства аховы помнікаў Віктар Вайтчук. Выстава складаецца з архіўных і сучасных здымкаў, на якіх выяўленыя планы сучаснай гарадской планіроўкі з тых жа кропак, з якіх рабіліся здымкі 80 і болей гадоў таму.

**Цёплае дрэва — халодны метал**

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 21 сакавіка** працуе выстава разьбяра і чаканшчыка Юрыя Адамовіча «Цёплае дрэва — халодны метал». Работы выкананыя ў мяшанай тэхніцы, што яднае ў сабе разьбу па дрэве і халодную, ручную, прарэзаную, аб'ёмную чаканку.

**Тэатр юнага гледача і яго гісторыя**

Чым жыў тэатр дзесяцігоддзі таму? Якімі афішамі заклікаў да сябе дзетак, а таксама іх бацькоў? Пра ўсё гэта можна даведацца на выставе, прысвечанай 55-годдзю творчай дзейнасці Тэатра юнага гледача, якая працуе **да 31 сакавіка ў «Гасцёўні Уладзіслава Галубка» (вул. Старавіленская, 14).**

**Кветкавы баль**

**У Музеі М.Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) да 9 сакавіка** працуе выстава фларыста Дзіны Шымук «Кветкавы баль». Дзіна Шымук — першы беларускі фларыст, яна працуе ў тэхніцы ашыбана. Гэта жывапіс раслінамі. Мастак збірае і засушвае кветкі, зёлкі, лісце, а пасля стварае з іх творы.

**Фактура і Эстамп**

**У Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3) да 14 сакавіка** працуе выстава віцебскіх мастакоў «Фактура». **Тамсама да 19 сакавіка** працуе выстава «Мастацтва эстампа». Эстамп — мастацкая графіка (аформ, літаграфія, гравюра). Выстава эстампа не праводзілася ўжо больш за дзесяць гадоў. Асноўву экспазіцыі складаюць работы, створаныя на базе Эксперыментальнай творчай майстэрні эстампа Саюза мастакоў.

## ТЭАТРЫ

**4 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»

**5 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**6 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка» (11.00)
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**7 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**9 сакавіка**

**Тэатр оперы і балета** — «Яўген Анегін»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**10 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»

**11 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**12 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»

**13 сакавіка**

**Тэатр лялек** — «Жахлівы спадар Ау»
**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэрак»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»

**14 сакавіка**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сублімацыя кахання»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

## КІНО

## Міленькае забойства, міленькі іншасвет

**Мілыя косткі** (The Lovely Bones)
ЗША — Вялікабрытанія — Новая Зеландыя, 2009, каляровы, 135 хв.
**Рэжысёр:** Пітэр Джэксан
**Жанр:** Містычная меладрама
**Адзнака:** 6 (з 10)




14-гадовую дзяўчынку (яе грае юная зорка Сірша Ронан) забіў сусед-маньяк. Цяпер гераіня з іншага свету назірае за жыццём сваякоў і марыць пакараць забойцу…

Стужка Пітэра Джэксана — падлеткавая містыка з музыкай Браяна Іна і тактоўнай адсутнасцю крывавых сцэнаў. Рэжысёр гуляе дэталямі, умела нагнятае хічкокаўскі саспенс.

Але, як і «Фантазіум доктара Парнаса», стужка хварэе на «безгеройнасць». Дзеянне там падмяняецца зрокавай раскошай. Што яшчэ важней, іншы свет — рэкламны буклет для падлеткаў, падступна-звабна пазбаўлены канфесійных прыкметаў.

Але скажыце яшчэ дзякуй, што аўтар «Страшыдлаў» і «Жывой мярцвячыны» абмежаваўся слязліва-медыумічным спатканнем з «мілымі косткамі».

**Андрэй Расінскі**

# Конкурс імя Ларысы Геніюш для маладых літаратараў



Беларускі ПЭН-Цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў, прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння Ларысы Геніюш.

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 15 да 26 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны семінар і майстар-класы ў Мінск, дзе змогуць прадставіць і абмеркаваць свае творы з вядомымі пісьменнікамі, выкладчыкамі, вучонымі.

Да разгляду журы прымаюцца вершы, кароткая проза, эсэістыка, пераклады.

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 10 красавіка 2010 г. Падвядзенне вынікаў адбудзецца 20 красавіка.

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: pen@vessobel.by (з пазнакай «Літаратурны конкурс»). Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-Цэнтр». Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.

# Рэйтынг самых шкодных для здароўя тэлефонаў

Амерыканская арганізацыя Environmental Working Group склала рэйтынг шкодных для здароўя мабільных тэлефонаў.

Для вымярэння велічыні шкоднага ўздзеяння мабільніка даследчыкі выкарыстоўваюць каэфіцыент SAR. Ён паказвае велічыню энергіі электрамагнітнага поля, якое абсарбіруецца тканінамі чалавечага цела і вымяраецца ў ватах на кілаграм. Чым меншы SAR, тым лепш. Яго велічыня залежыць ад некалькіх фактараў — стандарту, які выкарыстоўвае сотавая сувязь, тыпу антэны і яе размяшчэння адносна галавы карыстальніка.

Па выніках даследавання EWG была сфармавана база дадзеных 1268 тэлефонаў (у тым ліку смартфонаў) з указаннем параметра шкоднага ўздзеяння кожнага з іх. У дзясятку найлепшых па паказніку SAR увайшлі пяць тэлефонаў Samsung, два тэлефоны Motorola і адзін LG. У дзясятку найгоршых — іншыя пяць Motorola, адзін смартфон RIM і смартфон -Mobile myTouch 3G («гуглафон» HTC Magic, SAR 1,55 Вт/кг).







Для параўнання , Apple iPhone 3G паказаў максімальны SAR 1,39 Вт/кг, iPhone 3G S — 1,19 Вт/кг.

Уздзеянне мабільных тэлефонаў на здароўе чалавека хвалюе навукоўцаў не першы год. Даследаванні 2000—2001 гг., якія паказалі, што тэлефоны бясшкодныя, ахоплівалі невялікі прамежак часу, толькі 4—5 гадоў. Шведскія ж навукоўцы ў 2007 г. прыйшлі да высновы, што, калі тэлефонам карыстацца дзесяць гадоў, шанцы атрымаць злаякасную пухліну слыхавога нерва павялічваюцца ўдвая.

Крыніцы апраменьвання сёння атачаюць нас. Напрыклад, фон дае тая самая мікрахвалёўка. Але мабільнік застаецца адзіным прыстасаваннем са шкодным выпраменьваннем, якое чалавек трымае блізка да цела.

**Наста Шамрэй**

**Найменшы ўзровень радыяцыі**

Samsung Impression (SGH-a877) [AT&T]

Motorola RAZR V8 [CellularONE]

Samsung SGH-t229 [T-Mobile]

Samsung Rugby (SGH-a837) [AT&T]

Samsung Propel Pro (SGH-i627) [AT&T]

Samsung Gravity (SGH-t459) [CellularONE, T-Mobile]

T-Mobile Sidekick [T-Mobile]

LG Xenon (GR500) [AT&T]

Motorola Karma QA1 [AT&T]

Sanyo Katana II [Kajeet]

**Найбольшы ўзровень радыяцыі**

Motorola MOTO VU204 [Verizon Wireless]

T-Mobile myTouch 3G [T-Mobile]

Kyocera Jax S1300 [Virgin Mobile]

Blackberry Curve 8330 [Sprint, U.S. Cellular, Verizon Wireless, MetroPCS]

Motorola W385 [U.S. Cellular, Verizon Wireless]

T-Mobile Shadow [T-Mobile]

Motorola C290 [Sprint, Kajeet]

Motorola i335 [Sprint]

Motorola MOTO VE240 [Cricket, MetroPCS]

Blackberry Bold 9000 [AT&T]

**Сапраўдная беларуская кухня**

## Гарохаўка са свінінай

1,25 кг свініны, 1 цыбуля, 1 л гароху, 1 французская булка, 1 лыжка масла, солі па смаку.

4,5 шклянкі гароху заліць халоднай вадой, давесці да кіпення, пакласці 1,25 кг свежай свініны з прарасцю, пасаліць і варыць, пакуль гарох не стане мяккі. Пасля гэтага дастаць свініну, гарох перацерці праз сіта, зноў пакласці свініну ў суп і моцна нагрэць разам з працёртым гарохам, але не кіпяціць. Падаць разам з грэнкамі з французскай булкі, нарэзанымі кубікамі, падсмажанымі ў масле і падсушанымі.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Каханы мой муж Віктар!** Прымі найцудоўнейшыя і найпрыгажэйшыя віншаванні ад сваёй жоначкі і сыночка! Жадаем табе дасягненняў у працы і спорце! Спаўнення тваіх жаданняў! Цалуем цябе і цешымся, што ты ёсць з намі! Твая сям'я — Інэса і Эдвард Дэмбскія.

**КАНТАКТЫ**

**Адгукніцеся, калі ласка, спн. А. Нікалаева,** аўтарка тэксту «Некаторыя пытанні транслітарацыі...». Т.: (29) 761-88-84, (44) 743-78-63, z_sauka@yahoo.com.

**НАБУДУ ФІЛЬМ**

**Набуду фільм «Сівая легенда»,** рэжысёр Богдан Парэмба, 1991 г. Т.: (029) 179-04-38.

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем** у падарожжа ва Украіну «Падольскія фартэцыі» 26—29 сакавіка па маршруце: Камянец-Падольскі—Хоцін—Меджыбож. 7—11 красавіка — вандроўка «Тры сталіцы: Будапешт—Браціслава—Вена». Т.: (017) 292-54-58, (029) 622-57-20, (02) 110-19-28, (029) 509-12-16.

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа 7 сакавіка па маршруце: Іўе—Ліпнішкі—Суботнікі—Жамыслаўе—Тракелі—Больценікі—Беняконі—Гайцюнішкі—Канвелішкі. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ЗДАРОЎЕ

# Сем ідэй здаровага перакусу

Сучасны рытм жыцця прымушае нас усё рабіць хутка — хадзіць, думаць, есці... Але, на жаль, звыклыя гамбургеры, бутэрброды, ёгурты і тваражкі — скаромнае. Тлустыя прадукты адназначна павышаюць рызыку хваробаў — прычым не толькі сардэчных, але і стрававальнага шляху, ракавых, мужчынскіх. Дарэчы, цяпер пост. А што ў пост пасуе?

### Хлябцы

Хлябцы — гэта сучасны прадукт здаровага харчавання. Яны ўтрымліваюць вялікую колькасць клятчаткі і маюць высокую пажыўную каштоўнасць. Звычайна яны робяцца толькі з цэльнага збожжа розных відаў злакавых. У іх могуць быць розныя дадаткі, напрыклад, вітаміны і вострыя прыправы. Тэхналогія вытворчасці хлябцоў дазваляе захаваць вітаміны і мінеральныя рэчывы, якія ёсць у злакавых культурах.

### Абаранкавыя вырабы

Абаранкавыя вырабы — гэта традыцыйныя хлебабулачныя вырабы да гарбаты. Яны могуць быць у форме кольца або авала рознай велічыні і цвёрдасці. Да іх адносяцца абаранкі, сушкі, а таксама саломка і хлебныя палачкі.

### Садавіна, гародніна, арэхі, семкі і сухафрукты

Яблыкі, грушы, бананы і цытрусавыя, морква, капуста, памідоры і агуркі, фінікі, разынкі, курага і чарнасліў, арахіс, фундук, кэш'ю і міндаль — усяго не пералічыць. Выбірайце тое, што больш даспадобы.

### Печыва

Існуе мноства рэцэптаў прыгатавання печыва. Выбірайце тое, у склад якога не ўваходзяць прадукты жывёльнага паходжання, напрыклад, яйкі і масла.

### Батончыкі мюслі

Такія батончыкі вырабляюцца на аснове аўсяных, соевых і пшанічных шматкоў, экструдыяванай кукурузы і рысу, амаранту, сушанай садавіны, тлушчу расліннага паходжання і лецытыну. У батончыках няма цукрозы і хімічных кансервантаў.

### Пірагі

Посныя пірагі таксама можна выкарыстоўваць для перакусу. Але гатаваць іх давядзецца загадзя. Рэцэптаў посных пірагоў сапраўды шмат, і іх лёгка можна знайсці на прасторах інтэрнэту. Для начынкі выкарыстоўвайце грыбы, садавіну, ягады, арэхі, крупы і гародніну.



### Горкі шакалад

Хаця горкі шакалад паводле складу з'яўляецца посным прадуктам, на думку духавенства, сапраўды посным дэсертам яго назваць нельга. Але ўсё-такі па-за домам, калі знайсці нешта поснае цяжка, кавалачак горкага шакаладу не пашкодзіць.

**Крыніца: Здоровье.km.ru**

КАЛЯНДАР

## Сакавік

**3** — Міжнародны дзень пісьменніка.

**8** — Юбілейны Міжнародны жаночы дзень. 100 гадоў таму нямецкая сацыялістка Клара Цэткін прапанавала прызнаць 8 сакавіка днём барацьбы за жаночыя правы.

**11** — 25 гадоў таму (1985) на пасаду кіраўніка КПСС быў абраны Міхаіл Гарбачоў. Пачалася перабудова, у выніку якой Беларусь здабыла незалежнасць.

**15** — Дзень Канстытуцыі.

**17** — У Вільні 100 гадоў таму нарадзіўся Хведар Ільляшэвіч (1910—1948), пісьменнік, журналіст, выдавец.

**25** — Дзень Волі.

**28** — Вербніца, або Пальмавая нядзеля ў хрысціян.

**28** — 25 гадоў таму ў Францыі памёр мастак Марк Шагал. Праз усю сваю творчасць ён пранёс вобраз свайго роднага горада, Віцебска.

**ЛК**

# Газетка дзеткам



**1.** Частка цела.

**2.** Свойская жывёла.

**3.** У мужчын растуць вусы і ...

**4.** Некалькі жывёл разам.

**5.** Карысны салодкі напой

**6.** Добрая ... не замяніць дапамогі.

**7.** Прылада, якой разбіваюць грудкі ў полі.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |
| | А | | А | | А |

**Адказы глядзі на старонцы 16.**



ДЗЕД-БАРАДЗЕД

*Калыханка*

Я хаджу па белым свеце
І гляджу, як вы жывеце.
Калі трэба — памагу,
Бо я ўсё рабіць магу.

*Прыпеў:*
Хто я? Дзед-барадзед,
Абышоў белы свет,
А цяпер у ціхі час
Завітаў да вас.

З вамі побач буду ўсюды,
Трэба цуды — зробім цуды,
Трэба казка — раз, два, тры,
Вось і казка вам, сябры!

Вечарамі казкі баю,
Я ў запасе шмат іх маю.
А як прыйдзе казка ў сне,
Зноў кажыце: дзякуй мне…

Я хаджу па белым свеце —
Ваш найлепшы сябар, дзеці,
І вядома нават мне,
Што вы бачыце ўва сне.

**Словы Артура Вольскага, музыка Леаніда Захлеўнага**



Чэргі на аўтазапраўках за апошнім танным палівам. 27 лютага цэны на бензін зноў выраслі на 7%.



Адзін з самых драматычных момантаў Алімпіяды — параза расійскай хакейнай зборнай. Канада — чэмпіён!



Канадскія хакеісткі святкуюць перамогу. Дзяўчаты проста на лёдзе сталі курыць цыгары, піць піва і шампанскае, прыставаць да кіроўцаў залівачных машынаў, якія чысцілі ў гэты час лёд на лядовай арэне. Гэта выклікала сапраўдны скандал.




На сайце hcdinamo.by ідзе галасаванне за «Міс Дынама Мінск». Пакуль у лідэрках — тры прэтэндэнткі.





**Адказы да старонкі 15:**
галава, сабака, барада, чарада, какава, парада, барана.

## АНЕКДОТЫ

* * *

Неймавернае побач: калі б усе кітайцы хоць раз не паснедалі, жыхары Чукоткі маглі б харчавацца цэлых пяцьдзясят гадоў.

* * *

— Любы! А чаму даішнік свішча?

— Есці хоча...

* * *

На спаборніцтвах па сумо нехта намазаў татамі алеем... Гэты жарт доўга будуць памятаць гледачы з шэрагаў ад 1-га да 15-га!

* * *

— Калі вас першы раз забралі іншапланетнікі?

— Першы раз мяне забралі ў дзясятым класе. Толькі не іншапланетнікі...

* * *

Жанчына падбірае мужчыну гальштук пад колер кашулі, кашулю пад колер касцюма, а касцюм пад колер сваіх вачэй.

* * *

Маленькая хітрасць. Каб прывучыць ката да туалета, навучыце яго спачатку чытаць і курыць.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Вайна Кітая з Тыбетам**

Прычыны вайны Кітая з Тыбетам акуратна не вядомыя. Ведаем толькі, што Далай-Лама ўцёк ужо ад кітайцаў у Індыю — пад англіцкую апеку, ды што кітайскае войска грабіць цяпер храмы і забівае тыбецкі народ. Гэта вайна тым цікаўшая, што колькі гадоў таму назад, як на Тыбет ішлі англічане, Далай-лама ўцякаў у Пекін — прасіць у кітайцаў помачы проці англічан.

**«НН». №9. 1910**

**Допіс з турмы**

У дачыненні да амаль усіх асуджаных расійцаў ажыццяўляецца своеасаблівая «дыскрымінацыя» з боку суддзяў. Бедакі атрымалі дадаткова 2—3 гады звыш звычайнага для падобных дзеянняў тэрміну літаральна «толькі за тое, што ты сюды прыехаў». Іншым сказам, за што братка-беларус атрымлівае пяць-сем гадоў турмы, расіец — усе дзесяць.

**Зміцер Гарбуноў**
**«НН». №9. 2000**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 1035.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 02.03.2010.
Замова № 6315.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614